ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 9 (2278)
31 студзеня 1969 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

100

НА ЛЕНІНСКАЙ ВАХЦЕ— СЕЛЬСКІЯ КЛУБЫ

Са студзеня г. г. у краіне пачалася Усесаюзная пераклічка сельскіх клубаў, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Уключыліся ў гэтае спаборніцтва і сельскія клубныя ўстановы нашай рэспублікі.

Рэдакцыя папрасіла загадчыкаў раду раённых аддзелаў культуры расказаць пра ўдзел у гэтай пераклічцы, пра новыя формы клубнай работы, пра тое, як скарыстоўваецца вопыт, набыты ў час першай Усесаюзнай пераклічкі сельскіх клубаў. Вось што яны расказалі:

Таццяна КАРПАВА,

загадчыца Брагінскага раённага аддзела культуры

— Яшчэ ў час першай Усесаюзнай пераклічкі сельскіх клубаў мы паставілі перад сабой задачу — у нашых культасветустановах павінны працаваць людзі з адукацыяй не ніжэй сярэдняй. Мінула чатыры гады. За гэты час усе культасветработнікі ўжо або закончылі завочна спецыяльныя сярэднія навучальныя ўстановы, або здалі экзамены за сярэднюю школу. Сама я за гэты час закончыла Ленінградскі інстытут культуры.

Цяпер дабіваемся, каб нашы маладыя работнікі вучыліся ў вышэйшых навучальных установах. У раёне ёсць ужо 19 завочнікаў-студэнтаў Ленінградскага інстытута культуры, бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута, два загадчыкі клубаў вучацца ў Гомельскім музычным вучылішчы. Так мы вырашаем праблему кадраў.

Хвалюе нас тое, што пры агульных умовах клубныя ўстановы працуюць усё яшчэ па-рознаму. Прывяду прыклад. На тэрыторыі калгаса «Запаветы Леніна» працуюць тры клубы— Ясянёўскі, Спірыжскі і Дублінскі. У кожным з іх створаны аднолькава добрыя ўмовы для работы. Але першыя два клубы, можна сказаць, маякі, а Дублінскі працуе значна слабей.

Ставім перад сабой задачу — за час другой Усесаюзнай пераклічкі сельскіх клубаў узняць работу ўсіх нашых клубных устаноў да ўзроўню перадавых.

У раёне нямала робіцца, каб укараніць у быт новыя звычаі і святы. Ва ўрачыстай абстаноўцы ў сельскіх клубах праводзім рэгістрацыю шлюбаў. Гэтыя цырымоніі мы назвалі «Дарогай да шчасця». Да гэтага дня друкуем запрашальныя білеты, віншавальныя тэлеграмы, запісваем на магнітафонных стужках спецыяльную музыку і вясёлыя жартоўныя віншаванні. За апошнія гады ў нас не было выпадку, каб маладыя вянчаліся ў царкве.

Урачыста праводзім мы нашых хлопцаў у армію. Вачары гэтыя назвалі «Вы служыце— мы вас пачакаем». У многіх клубах ёсць стэнды «Яны абяцалі, і яны выканалі», на якіх змяшчаюцца падзякі камандавання за добрую службу прызыўнікоў, іх фота і іншыя матэрыялы.

Клопат пра клубы ў Брагінскім раёне стаў усенародным. Ужо на працягу некалькіх апошніх гадоў усе культасветустановы, як кажуць, сустракаюць зіму ва ўсеўзбраенні. Нам ахвотна памагаюць у гэтым мясцовыя партыйныя, савецкія і камсамольскія арганізацыі, праўленні калгасаў. Ва ўсіх клубах зімой цёпла, утульна, чыста.

Клара УСОВІЧ,

загадчыца Лепельскага раённага аддзела культуры

— Аддзел культуры разам з райкомам камсамола, склалі план работы на час пераклічкі. Назаву некалькі асноўных мерапрыемстваў. Мы правядзём агляд работы культасветустаноў раёна па камуністычным выхаванні моладзі. Вялікую ўвагу будзем аддаваць якасці, узроўню правядзення клубных вечароў, асабліва вечароў ушаноўвання старых камуністаў, актыўных удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэранаў працы. Запланавалі мы і некалькі цікавых паходаў моладзі Лепельшчыны па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы раёна.

А вось што ўжо робіцца па гэтых планах. Нядаўна прайшоў літаратурна-мастацкі вечар «Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны» ў Несенскім сельскім клубе. Усхвалявана расказвалі ветэраны вайны пра гераізм савецкіх людзей на франтах і ў партызанскіх атрадах. Слухала моладзь расказы ўважліва, задавала многа пытанняў.

Вельмі цёпла і шчыра прайшоў тэматычны вечар «Нам завяшчаў Ільіч» у Слабадскім сельскім клубе і вечар сустрэчы трох пакаленняў у Бабчанскім клубе.

Бібліятэка і клуб калгаса імя Чкалава разам падрыхтавалі і правялі маладзёжную канферэнцыю па рабоце У. І. Леніна «Задачы саюзаў моладзі».

Леанід ПЫЛ,

загадчык Крупскага раённага аддзела культуры

— Нашы клубы рыхтуюцца цяпер да раённага агляду сельскай мастацкай самадзейнасці, які мы мяркуем правесці ў маі. Думаю, што гэты агляд дапаможа замацаваць і развіць тыя поспехі, якія дасягнуты за час падрыхтоўкі да агляду, прысвечанага 50-годдзю БССР і КПБ.

Сённяшні наш клопат — забяспечыць самадзейныя калектывы, асабліва хоры і вакальныя ансамблі, надзённым рэпертуарам — песнямі аб Леніне, партыі і Радзіме. Сёе-тое ёсць у метадычным кабінеце пры раённай бібліятэцы. Спадзяёмся, што абласны Дом народнай творчасці ў бліжэйшы час прышле нам новыя песні беларускіх кампазітараў, новыя запісы і апрацоўкі народных песень.

Усе клубы раёна рыхтуюцца зараз да свята зімы. Яшчэ некалькі гадоў назад вясёлае зімовае свята праводзілася толькі ў Крупках, а цяпер яно адбудзецца ва ўсіх сельсаветах.

На парадку дня —абнаўленне нагляднай агітацыі ў клубах. Патрэбны цікавыя маляўнічыя стэнды, плакаты, лозунгі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Мяркуем правесці конкурс на лепшае афармленне клубных устаноў. У нас ёсць клубы, якія могуць быць у гэтых адносінах прыкладам. Гэта Абчугскі, Крупскі і Начскі сельскія клубы, Бобрскі Дом культуры. Іх багаты вопыт афармлення нагляднай агітацыі да юбілею рэспублікі варты пераймання. На базе адной з гэтых устаноў культуры мяркуем наладзіць семінар па мастацкім афармленні клубных памяшканняў.

Уладзімір ПАСЬКО,

загадчык Слуцкага раённага аддзела культуры

— Напярэдадні 50-годдзя нашай рэспублікі адбылося ўрачыстае адкрыццё прыгожага двухпавярховага Палаца культуры на 360 месц у калгасе імя Дзяржынскага. Са згоды праўлення калгаса мы адкрылі ў ім раённы Дом кульуры, які зробім метадычным цэнтрам усёй работы нашых клубаў.

Такія ж палацы культуры будуюць калгасы імя Мічурына, імя Энгельса, дамы культуры— «Савецкая Беларусь» і імя Будзённага. У раёне ўзводзяцца яшчэ чатыры брыгадныя клубы.

Нядаўна на базе Ленінскага сельскага клуба мы правялі семінар работнікаў культуры раёна, які прысвяцілі афармленню клубаў да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага правадыра.

Вопыт паказаў, што вечары сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі, арганізатарамі Савецкай улады, першымі камсамольцамі, героямі вайны і працы карыстаюцца ў сельскага насельніцтва поспехам. Мы і далей будзем праводзіць у сельскіх клубах такія сустрэчы.

Разам з дырэкцыяй раённай кінасеткі рыхтуемся да фестывалю кінафільмаў, прысвечаных У. І. Леніну і яго паплечнікам. Перад пачаткам сеансаў будзем праводзіць гутаркі аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці правадыра працоўных, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Мяркуем, што за час пераклічкі сельскіх клубаў нам удасца стварыць у кожным клубе калектыў мастацкай самадзейнасці, які б працаваў не ад агляду да агляду, а сістэматычна, як скажам, наш Казловіцкі народны хор.

Анатоль МІНАКОЎ,

загадчык Горацкага раённага аддзела культуры

— У нашым раёне працуюць трыццаць пяць клубаў, шэсць з іх уступілі ў строй летась. У кожным з іх ёсць тэлевізар, на яго блакітны агеньчык ахвотна ідуць жыхары вёскі. Работнікі клубаў уключаюць у планы работы калектыўны прагляд і абмеркаванне тэлеперадач, праслухоўванне лекцый.

Зараз у нашым раёне ёсць 38 куткоў і пакояў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Яны сабралі надзвычай цікавы і каштоўны матэрыял па гісторыі родных мясцін. Усе куткі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы папаўняем цяпер матэрыяламі пра Леніна. За час пераклічкі такія куткі і пакоі будуць адкрыты пры кожным клубе.

Распрацавана тэматыка ленінскіх чытанняў. У сельскіх клубах пачалі ўжо выступаць лектары і дакладчыкі. Да кожнага чытання бібліятэкары рыхтуюць тэматычныя выстаўкі кніг, рэкамендацыйныя спіскі літаратуры, плакаты.

На старонках раённай газеты пачалася завочная канферэнцыя чытачоў, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У ёй прымуць актыўны ўдзел і работнікі культасветустаноў. Тэма іх выступленняў — «Ленін у маім жыцці», «Ленін аб культурнай рэвалюцыі ў нашай краіне» і г. д.

ПАСЛЯ МЕСЯЧНІКА КНІГІ

Месячнік кнігі, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, паспрыяў шырокай прапагандзе юбілейнай літаратуры і твораў беларускіх пісьменнікаў сярод працаўнікоў горада і вёскі. У кніжных магазінах былі наладжаны тэматычныя выстаўкі і продаж гэтых выданняў, адбываліся літартурныя вечары, сустрэчы з пісьменнікамі, выезды на прадпрыемствы, у навучальныя ўстановы.

Магазіны Гомельскага аблкнігагандлю за час месячніка прадалі 250 бібліятэчак, укамплектаваных юбілейнай літаратурай.

Добра працавалі ў час месячніка многія калектывы магазінаў Брэсцкага аблкнігагандлю. Дапамагалі работнікам прылаўка грамадскія распаўсюджвальнікі кніг. Швачка Баранавіцкай швейнай фабрыкі Н. Ламейка прадала кніг больш чым на 250 рублёў, работніца Пінскага Дома піянераў А. Усава—на 150 руб., Брэсцкі чыгуначнік А. Бажко—больш чым на сто рублёў.

Нямала цікавых мерапрыемстваў правялі магазіны Мінскага аблкнігагандлю: сустрэчы з пісьменнікамі ў Цэнтральным кніжным магазіне, літаратурныя вечары, святы кнігі і вечары паэзіі ў палітэхнічным інстытуце, на філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта, на Мінскім гадзіннікавым заводзе.

Месячнік кнігі дапамог магазінам Упраўлення кніжнага гандлю паспяхова выканаць снежаньскі план. Па рэспубліцы дзяржаўная кнігагандлёвая сетка прадала ў розніцу звыш гадавога плана на 667 тысяч рублёў літаратуры, палавіну гэтай сумы далі калектывы магазінаў Мінскага аблкнігагандлю. Многа літаратуры звыш плана прадалі ў розніцу Віцебскі, Брэсцкі і Магілёўскі аблкнігагандлі.

ЗРОБЛЕНА НАРОДНЫМІ ЎМЕЛЬЦАМІ

У Брэсце ў Доме тэхнікі адкрылася абласная выстаўка работ самадзейных мастакоў — жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Увагу наведвальнікаў выстаўкі прыцягвае пано «Ленін» Аляксандры Камаровай. Вышывальшчыца ўмела знаходзіць мяккія спалучэнні нітак бежавага і карычневага колераў на глыбокім, чыстым чырвоным фоне сукна. Посцілкі і ручнікі, вытканыя майстрыхамі Ганцавіцкага раёна М. Кош, В. Рубцэвіч, М. Целагуз і А. Рубцэвіч, вызначаюцца яркім каларытам, прыгожым арнаментальным узорам. З густам вышыты З. Шыкуновай камплект «Белавежская пушча» (парцьеры, настольнік, пано).

Цікавыя пошукі разбяра па дрэве В. Манухі. У кампазіцыі «Бетховен» майстар умела выкарыстоўвае матэрыял: выгіб дрэва, хвалістая паверхня, цёмны колер завяршаюць мадэліроўку галавы вялікага кампазітара.

Уражваюць работы аднаго з вядучых разбяроў-інкрустатараў Брэстчыны Д. Сакажынскага пано «Я. Купала» і «Зубр» (разьба). Народны ўмелец І. Лук паказвае на выстаўцы свае рэльефы «Ленін у Разліве», «Рыбак» і інш. Побач з работамі бацькі экспануюцца работы яго сына, вучня сярэдняй школы П. Лука.

Арыгінальныя работы з саломкі жыхаркі Брэста В. Гаўрылюк — «Вяселле», «Музыканты», «На кірмаш», а таксама вытканыя з саломы сурвэткі і жаночыя сумачкі, упрыгожаныя каляровым арнаментальным узорам, які добра спалучаецца з залатой саломкай.

Самабытныя, ураўнаважаныя па кампазіцыі, са сціплым дэкорам гладыш, макітра і іншыя рэчы пружанскага ганчара А. Такарэцкага.

У спакойнай гаме, жыццесцвярджальным каларыце выкананы карціны жывапісца-аматара з Камянца Г. Фёдарава. Мастак К. Шахалевіч піша пейзажы, знаёмыя яму з маленства. Асабліва ўдалая яго кампазіцыя «Зіма. Камянец». Зімні пейзаж напісаны ім свежа, з настроем.

Т. ВАЛАДЗЬКО.

САЛІГОРСКАЯ ГЕАМЕТРЫЯ.

Фотаэцюд Э. ТРЫГУБОВІЧА.

«ЛЕТАПІС» 1969

На стыку двух гадоў адзначала Беларусь сваё 50-годдзе. 1968 ужо адыходзіў, даўшы нам звышгукавы самалёт ТУ-144, палёт у космас Берагавога, новыя машыны Мінскага аўтамабільнага, дзесяткі маладых вучоных, эксперыментальныя дамы будучага, вялікія планы, надзеі... А новы—1969 з запалам і гарачнасцю маладосці, імкліва захопліваў «рубяжы», браў разгон...

На стыку двух гадоў адзначала Беларусь сваё 50-годдзе. І ўсе, каму давялося пабываць на гэтым свяце, надоўга запомняць яго. Дзесяткі тысяч лямпачак, што запаліліся на вуліцах, замільгалі на ёлках, на ахутаных намаразззю дрэвах,—пераўтварылі Мінск у казачнае царства. У кажушках, якія ва ўсім свеце завуцца «а ля рус», у пушыстых футравых шапках, у каляровых «паўлаўскіх» хустках жанчыны здаваліся феямі і чараўніцамі. А мужчыны ў яркіх капронавых куртках, вязаных шапках-шлемах—прышэльцамі з іншых планет.

Вуліцы чырванелі флагамі і лозунгамі. На заводах і фабрыках, ва ўстановах і вну, школах рыхтаваліся да свята. У тэатрах ішлі апошнія рэпетыцыі спектакляў, прысвечаных юбілею.

Свята закончылася парадам войск і дэманстрацыяй.

Аб усім гэтым раскажуць у сваім новым паўнаметражным фільме «Нам 50» беларускія кінадакументалісты.

— Фільм гэты будзе і каляровы, там, дзе колер неабходны, і чорна-белы, каб падкрэсліць строгасць урачыстых сустрэч, прыёмаў, дзелавых гутарак,—гаворыць Алена Аляксандраўна Астроўская, галоўны рэдактар аднаго з аб'яднанняў «Беларусьфільма»—«Летапіс». Натуральна, што дэманстрацыя знята ў колеры—гэта цудоўнае відовішча, і нашчадкам нашым цікава будзе ўбачыць, як умелі радавацца і жыць людзі шасцідзесятых.

Работа ў разгары: ідзе мантаж, даздымка. Над стварэннем гэтага фільма працуе вялікі калектыў: сцэнарыст А. Вялюгін, рэжысёр І. Вейняровіч, аператары У. Цяслюк, М. Бераў і іншыя.

На стале ў Алены Аляксандраўны—папкі, паперы з пячаткамі і без пячатак... Адну з іх яна дае мне прачытаць. «На Сусветнай выстаўцы ў г. Асака (Японія), якая адбудзецца ў 1970 годзе, будуць праводзіцца дні нацыянальных рэспублік СССР...»

— Гэта значыць,—гаворыць Алена Аляксандраўна,—што трэба ўжо зараз пачынаць здымкі фільма аб Беларусі. Тым болей, што мы ідзём наперад хутка, што нашы ўчарашнія дасягненні сёння ўжо саступаюць месца новым адкрыццям, знаходкам, перамогам. Таму фільм, зняты нават зусім нядаўна, ужо здаецца архаічным, старым.

Я на некаторы час пакідаю кабінет галоўнага рэдактара. Справа ў тым, што залы праглядаў распісаны па мінутах, а вось якраз зараз ёсць магчымасць не толькі пачуць аб новых фільмах, але і ўбачыць іх. Апошнія блікі кладзе рэжысёр і аператар І. Пікман. Фільм, зняты ім, у нейкай меры эксперыментальны. Яго героі — цені, а галоўны сярод іх — Сілуэцік. Ён расказвае нам аб рэчах вельмі сур'ёзных: аб гігіене разумовай працы, аб размеркаванні часу (якога, дарэчы кажучы, так не хапае ў наш век). Але расказвае аб гэтым з добрым гумарам, я б нават сказала, гарэзліва, жыва, цікава. І пераканаўча. Ва ўсякім разе здаецца, што з гэтай мінуты ты пачнеш жыць інакш. Паглядзім, паглядзім...

— За адзін месяц гэтага года адбылося так многа, што аб усім і не раскажаш,—працягвала Алена Аляксандраўна, калі я вярнулася.— Днямі правялі мастацкі савет. Першыя фільмы гэтага года атрымалі высокі бал — першую групу. Аднадушна быў прыняты фільм рэжысёра Ю. Лысятава і сцэнарыста Б. Казанава «Паляванне са старым сабакам». Не буду расказваць яго змест. Хутка самі ўбачыце. Скажу толькі, што гэта вельмі чалавечны, добры фільм.

Цікавым атрымаўся хранікальны спецвыпуск «Нас вадзіла маладосць». Ён прысвечаны Ленінскаму камсамолу. Рэжысёр В. Дашук выкарыстаў рэдкія матэрыялы хронікі, ну і, натуральна, уклаў у фільм сваё ўменне і сэрца.

Падводзяцца вынікі мінулага года, завяршаецца работа над новымі фільмамі гэтага. Першаму ў 1969 годзе стартаваць выпала рэжысёру П. Аліфярэнка. Яму засталося толькі запісаць тэкст. Яго фільм «Дарога, гітара і гаечны ключ» (умоўная назва) — аб рабочым класе, аб брыгадзе новай тэхнікі з Наваполацка.

Беларускія кінадакументалісты ўвесь час у дарозе і ў прамым і ў пераносным сэнсе гэтага слова. За тры тыдні новага года разляцеліся, раз'ехаліся ў розныя куткі рэспублікі кінаэкспедыцыі. У Віцебску здымае старэйшы кінааператар Д. Фрыд, у глыбінных раёнах працуе група на чале з рэжысёрам У. Віннікавым. Яны здымаюць фільм аб сваіх бліжэйшых таварышах—сельскіх кінамеханіках.

А рэжысёр-аператар В. Шаталаў гэтымі днямі вярнуўся ў Мінск. Паўгода хадзіў ён па марах і акіянах, здымаў фільм аб танкеры «Героі Брэста».

І вось я ўжо гартаю новыя сцэнарыі. Рэжысёр і сцэнарыст А. Спешнеў перадаў на студыю сцэнарый двухчасткавага фільма «Сем ступеняў пасля паўдня». Аб часе. Аб захавальніцах дакладнага часу. Аб тым, як гэта важна — дакладны час...

Аб следчым па асоба важных справах расказвае ў сваім сцэнарыі М. Вінагораў.

Паэтычны, прасякнуты вялікай любоўю да роднай вёскі, маці, зямлі, да сваёй Беларусі—сцэнарый В. Дашука.

Ул. Мехаў расказвае ў сцэнарыі пра беларуса Судзілоўскага, які быў першым прэзідэнтам сената на... Гавайскіх астравах.

Але галоўнае, чым займаецца зараз сцэнарны аддзел творчага аб'яднання,—падрыхтоўка сцэнарыяў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. «Пісьмы Ільічу», «Ленінскім маршрутам», «Леніна» — вось назвы толькі некаторых фільмаў на гэтую тэму. Анатоль Вялюгін працуе над сцэнарыем аб саратніку Леніна — Дзяржынскім, яго сябрах і родных. Рэжысёр П. Аліфярэнка рыхтуецца здымаць фільм аб братах Бонч-Бруевічах.

Магчыма, што некалькі фільмаў будуць аб'яднаны ў кінаальманах. Такі вопыт у кінааб'яднанні «Летапіс» ужо ёсць: якраз у гэтыя дні на экраны рэспублікі выйшаў кінаальманах «Штрыхі да партрэта».

Першыя крокі новага года... Першыя дзеці, у метрыках якіх з'явіцца: «Год нараджэння 1969-ы», першыя паверхі новых будынкаў, першыя метры новых кінастужак.

І. ПІСЬМЕННАЯ.

БУДНІ АРХІТЭКТАРАЎ

ПРАЕКТУЮЦЬ ШЭФЫ

Востраў Зыслаў на Любаншчыне быў у гады вайны месцам дыслакацыі штаба партызанскай брыгады. Тут знаходзіліся падпольны райком і абком, працаваў аэрадром. Востраў вырашана ператварыць у партызанскі музей пад адкрытым небам. Работы па яго праектаванні выканалі шэфы— архітэктары «Белгіпрасельбуда».

Саўгасы «Ждановічы» і «Ленінскі» Мінскага раёна падшэфныя ў архітэктараў «Мінскпраекта». Супрацоўнікі інстытута дапамагаюць ім добраўпарадкаваць і азеляніць тэрыторыі пасёлкаў. Каб лепш выканаць заказы падшэфных арганізацый, у інстытуце стварылі грамадскае архітэктурна-канструктарскае бюро. Летась яно выдала шэсць праектаў, у тым ліку праект актавай залы на 200 месц, спартыўнага павільёна, праект рэканструкцыі і пашырэння спартыўнай базы.

На грамадскіх асновах архітэктар В. Бажко выканаў у Гродна праект дзіцячага стадыёна, а ў саўтарстве з І. Мазнічкай — праект юбілейнага сквера.

Нямалую дапамогу аказваюць архітэктары школам, прапагандуюць сярод школьнікаў веды па архітэктуры.

ПА ПУЦЁЎКАХ ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»

«Лекцыю чытае архітэктар»... Усё часцей афішы з такім надпісам з'яўляюцца ў палацах культуры, чырвоных кутках прадпрыемстваў, у навучальных установах і воінскіх часцях.

«Перспектывы развіцця Мінска», «Савецкая архітэктура за 50 гадоў», «Жыллёвае будаўніцтва ў СССР» — вось тэмы лекцый, з якімі выступаў у цэхах заводаў імя Леніна, імя Арджанікідзе, «Ударнік» дацэнт кафедры архітэктуры Беларускага політэхнічнага інстытута А. Наканечны.

«Віцебск учора, сёння і заўтра» — так называлася лекцыя, з якой выступіў у часцях мясцовага гарнізона старшыня абласнога аддзялення Саюза архітэктараў БССР А. Фрыдман.

Каля 60 лекцый прачыталі супрацоўнікі праектнага інстытута «Мінскпраект» Г. Горына, Л. Кантаровіч, М. Марокін, Л. Левін, Г. Фадзеева. Архітэктары суправаджаюць гасцей сталіцы ў экскурсіях па горадзе, даюць тлумачэнні на новабудоўлях, кансультуюць экскурсаводаў.

ЗДЫМАЕЦЦА КІНО

У 1961 годзе група супрацоўнікаў «Белгіпрасельбуда» выязджала на цаліну ў Какчатаўскую вобласць, дзе па праектах інстытута будаваліся саўгасныя пасёлкі. І ў Мінску, і там, у казахстанскім стэпе, шмат было спрэчак аб тым, якімі павінны быць новыя сялібы. Вось таму і было вырашана зняць фільм, каб мець пад рукамі, як кажуць, рашучы аргумент. Але так ужо атрымалася, што стужка, знятая «ў вучэбных мэтах», стала і мастацкім дакументам.

Ёсць нешта агульнае паміж фільмам, які знялі тады кінааматары «Белгіпрасельбуда» і тымі, якія яны здымаюць сёння. Зноў галоўная тэма — будаўніцтва на вёсцы, зноў кадры павінны дапамагчы параўнаць, зрабіць выбар, нешта ўхваліць, ад нечага адмовіцца.

Новы фільм, які здымаюць кінааматары «Белгіпрасельбуда» В. Емяльянаў, Р. Шык, І. Каробкін, Б. Гарбуноў, Б. Казакоў, В. Бараноўскі, прысвечаны эксперыментальнаму домабудаванню ў калгасе імя Калініна Нясвіжскага раёна, саўгасе «Чырвоная звязда» Клецкага раёна, саўгасе «Мухавец» Брэсцкага раёна і шмат якіх іншых. Двухпавярховыя дамы з усімі выгодамі, сучасныя інтэр'еры, грамадскія будынкі па індывідуальных праектах, новая планіроўка сяліб — камера не толькі адлюстроўвае, яна даследуе, дапамагае гледачу зрабіць вывад.

Свой новы фільм аматары «Белгіпрасельбуда» мяркуюць паказаць удзельнікам усесаюзнага семінара па сельскаму будаўніцтву, які будзе праходзіць у Мінску.

ПЕСНЯ ПАЙШЛА Ў ДАРОГУ

НОВАЯ ПРАГРАМА ДЗЯРЖАЎНАГА НАРОДНАГА ХОРУ БССР

Мастацкі кіраўнік узмахнуў рукой і ў вялікую залу шырока і павольна паплыла песня. Не паспелі змоўкнуць апошнія акорды баянаў, як на сцэну выйшлі танцоры і закружыліся ў імклівай віхуры кадрылі. Танцы і песні змяняліся, і час ад часу ў зале чуўся адзінокі хлапок у далоні. Тады артысты заміралі і слухалі спакойны голас мастацкага кіраўніка:

— Адсюль пачнем яшчэ раз!

Спевакі і танцоры зноў і зноў паўтаралі кожны куплет песні і настойліва адпрацоўвалі кожнае па ў танцы.

Усё гэта мне давялося пабачыць і пачуць на апошняй рэпетыцыі Дзяржаўнага народнага хору БССР перад яго гастрольнай паездкай па гарадах і вёсках Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. Калектыў павёз у гэтую паездку сваю абноўленую праграму. Мы доўга гутарылі з мастацкім кіраўніком хору, народным артыстам СССР Генадзем Іванавічам Цітовічам, і ён расказаў аб творчых пошуках артыстаў, аб новай праграме.

— Асноўную ўвагу, — гаворыць Генадзь Іванавіч, — пры абнаўленні праграмы мы ўдзялялі народнай песеннай і харэаграфічнай творчасці. Мы настойліва шукалі новыя формы, каб паўней паказаць гэтую вялікую спадчыну.

У новай праграме прадстаўлены творы і прафесіянальных кампазітараў і паэтаў, творы братніх народаў. У першым аддзяленні выконваюцца песні У. Алоўнікава на словы Р. Барадуліна «Вочы Беларусі» і «Застольная» на словы і музыку А. Русака, песня Ю. Семянякі «Беларусь сінявокая» на словы А. Русака, «Песня дружбы» А. Граса на словы паэта А. Пракоф'ева, а таксама беларускія народныя песні «Бяроза», «Служыла я ў пана» ў апрацоўцы К. Паплаўскага, руская народная песня «За Кубанью, за рекой» у апрацоўцы І. Кузняцова, украінская жартоўная песня «Як муж жонку сповідаў».

У выкананні мужчынскай і жаночай групы хору зноў загучалі песня Ю. Талесніка «Радзіма» (словы А. Пракоф'ева), «Песня партызан» У. Алоўнікава на словы К. Кірэенкі з кінафільма «Міколка-паравоз», беларуская жартоўная песня А. Русака «Як правёў мяне Цімох» у апрацоўцы А. Валынчыка.

З вакальна-харэаграфічных твораў трэба адзначыць сцэнічную карцінку «Свята на граніцы» (музыка В. Салаўёва-Сядога, І. Любана, Р. Галавасцікава) у пастаноўцы С. Дрэчына, «Рускі танец», пастаўлены П. Акулёнкам, і «Лядкаўскую кадрылю», запісаную ў адным з раёнаў Гродзеншчыны і пастаўленую артыстам А. Бяловым.

У другое аддзяленне канцэртнай праграмы ўвайшлі беларускія народныя песні «Ой, рана на Івана» ў апрацоўцы Г. Цітовіча, «Як я ў мамкі жыла» (апрацоўка К. Паплаўскага), «Маладая Насцечка, як жывеш?» у апрацоўцы Я. Грамыкі, дзявочы карагод «Лебядзінчачка» (музыка І. Кузняцова, пастаноўка танца балетмайстра І. Хвораста), «Варыяцыі на рускую тэму» М. Шалаева, «Палеская рапсодыя» К. Паплаўскага і «Мінскі вальс» (музыка М. Шуміліна, словы А. Бачылы) у вакальна-харэаграфічным выкананні салістаў хору і балета (пастаноўка С. Дрэчына).

— Наш хор, — сказаў у заключэнне Г. Цітовіч, — поўны творчых сіл і энергіі. А ацэнку новай праграмы дадуць гледачы ў час нашай паездкі па гарадах і вёсках роднай Беларусі.

І. СУЧКОЎ.

На гэтым здымку вы бачыце мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага народнага хору БССР, народнага артыста Савецкага Саюза Г. Цітовіча і артыстаў балету (злева направа): К. Новак, Б. Сераду, І. Кірылічаву і Т. Кліміну ў час рэпетыцыі.

Фота А. ЛУКАШОВА.

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА Н. К. КРУПСКАЙ

Работнікі Віцебскай абласной дзіцячай бібліятэкі рыхтуюцца да стагоддзя з дня нараджэння жонкі, друга і паплечніка У. І. Леніна Надзежды Канстанцінаўны Крупскай. У школах, раённых дзіцячых бібліятэках, на прадпрыемствах вобласці яны чытаюць лекцыі, праводзяць гутаркі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці Н. К. Крупскай. Дырэктар бібліятэкі М. Жылінская выступіла з дакладамі на фабрыцы мастацкіх вырабаў і ў школах №№ 1 і 2 гарадскога пасёлка Бешанковічы.

Ва ўсіх аддзелах абласной бібліятэкі, якая носіць імя Н. К. Крупскай, вісяць плакаты, наладжаны кніжныя ілюстрацыйныя выстаўкі: «Слаўная бальшавічка», «Друг вялікі—друг клапатлівы». Нядаўна тут адбыўся ранішнік, прысвечаны Н. К. Крупскай.

Рыхтуецца таксама навуковая канферэнцыя работнікаў дзіцячых бібліятэк вобласці на тэму: «Ажыццяўленне запаветаў Н. К. Крупскай у бібліятэчнай рабоце з дзецьмі».

Ф. НІКАЛАЕЎ.

ЮБІЛЕЙНАЯ МАСТАЦКАЯ

ЗДАБЫТКІ І ВЫДАТКІ ГРАФІКІ

КОЛА тэм графікі на юбілейнай мастацкай выстаўцы «50 гадоў БССР і КПБ» прадвызначана вядучай тэмай усёй экспазіцыі: «Радзіма, Кампартыя, Народ». Падзеі даўняга і нядаўняга мінулага, Вялікі Кастрычнік і Ленін, грамадзянская і Вялікая Айчынная войны, героі рэвалюцыі і героі нашых дзён, прырода роднага краю, вобразы, народжаныя народнай фантазіяй...

Найбольш шырока і ўсебакова ў графічных творах выстаўкі адлюстраваны такія вехі ў гісторыі сацыялістычнай дзяржавы, як Вялікі Кастрычнік і Айчынная вайна.

Аднак, хоць да тэматыкі рэвалюцыі звярнулася даволі шырокае кола аўтараў, нікому з іх, на жаль, не ўдалося ўзняцца вышэй ілюстрацыйнага пераказу пэўных эпізодаў рэвалюцыйнага руху на Беларусі. Гэта аднолькава датычыць С. Раманава і Я. Ціхановіча, якія выступілі з серыямі лістоў на гісторыка-рэвалюцыйную тэму. Лінагравюры С. Раманава «Падзел панскіх зямель», «Гарадскі мітынг», «Сельская бібліятэка» прысвечаны прыходу новага жыцця ў беларускія вёскі і гарады. Але мова, якой вядзецца гаворка пра хвалюючыя падзеі, — вялая, невыразная. Па сутнасці, у творах няма вобразнага асэнсавання падзей, абагуленага, узнятага над «літаратурным сюжэтам» мастакоўскага рашэння тэмы. Бракуе свежасці, навізны думкі і яе ўвасаблення і лістам Я. Ціхановіча «Сацыялістычная рэвалюцыя ў Беларусі» («Ліквідацыя непісьменнасці», «Уступленне ў калгас», «Дэкрэт аб міры»). Нельга прызнаць завершанымі і работы А. Агафоненкі «Саборная плошча», М. Макаранкі «На пераправе», А. Рыбчынскага «Забастоўка». Аўтарам гэтых лістоў бракуе выразнасці задумы.

Бадай, найбольш удалыя на выстаўцы творы, прысвечаныя падзеям Айчыннай вайны.

У вялікай серыі «Мінскае падполле» Л. Асецкага арганічна спалучыліся грунтоўная апавядальнасць і старанна прадуманая структура вобразаў. Л. Асецкі дабіваецца, каб з кожным новым лістом патрэбнае ўражанне ўзмацнялася. «Буйным планам» акцэнтуюцца моманты, якія маюць прынцыповае значэнне для ідэйна-мастацкага гучання серыі. Прымененыя кампазіцыйныя прыёмы дазволілі мастаку пры вялікай «зрокавай нагрузцы» ўсіх лістоў захаваць эмацыянальнае ўздзеянне кожнага з іх, строга падпарадкаваць кожны асноўнай думцы, з якой лагічна ўвязаны ўсе фрагменты. Так, напрыклад, зусім невыпадкова мастак дзеліць ліст «1941 год» такім чынам, што панарама горада вузкім фрызам расцягнута ў нізе ліста. А ў другім лісце — «Звязда» — гэты ж фрагмент ён размяшчае ўздоўж верхняга краю. Усё абумоўлена ўнутранай логікай адлюстраваных падзей: у першым выпадку — насцярожаны горад, які стаіўся ў жаху, прыдаўлены фашысцкім ботам, а ў другім — горад, поўны невідочнага руху, чакання значных падзей, якія наспяваюць падспудна, у падполлі. І не дзеля знешняй разнастайнасці мастак расчляняе кожны ліст на фрагменты. Прасочваючы падзеі ў кожным такім кадры, бачыш, наколькі ўмела аўтар прымушае іх узаемадзейнічаць, як дакладна абумоўлена з'яўленне кожнага новага фрагмента з папярэдняга. Трывалая прычынная сувязь фрагментаў не дазваляе гледачу выпусціць з-пад увагі ні адзін з іх. Аднак, на жаль, дынамічная і лаканічная мова лінагравюры, так удала скарыстаная Л. Асецкім у лістах «1941 год» і «Звязда», становіцца вялай у двух другіх — «Да зброі» і «Адзінагалосна».

Немагчыма раўнадушна абысці новую работу Г. Паплаўскага — серыю літаграфій «Памяць». Мастак мужнага таленту, душэўна засяроджаны, сапраўды інтэлектуальны, у новай рабоце яшчэ раз пацвердзіў сваю выразную грамадзянскую пазіцыю. Але «Памяць» моцна адрозніваецца ад папярэдніх работ якімсьці адкрыта экспрэсіўным, павышана-эмацыянальным стылем.

Вось, напрыклад, ліст «Чытаючы матэрыялы Надзвычайнай камісіі». Мы бачым паралізаваную горам, аглушаную жахлівымі карцінамі фашысцкіх злачынстаў старую. Даведзены да гранічнай экспрэсіі чалавечы вобраз абрамлены быццам высечанымі на камені подпісамі: «Вялікі Трасцянец — 34 ямы-магілы. Пахавана 150.000 чалавек», «Малы Трасцянец—спалена ў печы 50.000 чалавек». І далей — «33.000»... «20.000»... Жудасная статыстыка смерці. Жудасная «інфармацыя», якая мяжуе з нерэальнасцю, скарыстаная Г. Паплаўскім, выліваецца ў гэтай серыі лістоў у палымяны публіцыстычны нарыс. Мастак, як заклінанне, паўтарае: памятаць, памятаць, памятаць...

Вострая форма, калі яна не выклікана вострым зместам, становіцца знешнім прыёмам, ператвараецца ў самамэту. Г. Паплаўскі цалкам выключае для сябе гэтую небяспеку.

З ГРАФІЧНЫХ твораў пра нашу сучаснасць найбольш выдзяляюцца лісты, прысвечаныя жыццю вёскі.

Удала распачатая гродзенскім графікам А. Захаравым распрацоўка жанрава-бытавой тэмы яшчэ на мінулых выстаўках («Сям'я», «Бабіна лета») знайшла свой натуральны працяг у новай рабоце «Свеціць месяц» (гэты ліст як бы завяршае своеасаблівы трыпціх). Аўтар свядома некалькі ідэалізуе сцэну адпачынку сельскай моладзі. Ён лёгка і натуральна знаходзіць тыя невідочныя штрыхі і прыкметы, якія робяць вобразы яго герояў ды і ўсю кампазіцыйную пабудову ліста ў цэлым блізкімі да народных уяўленняў аб прыгажосці.

Бадай, найбольш паслядоўная ў сваім захапленні сённяшнім вясковым побытам А. Паслядовіч — мастак чыстага, нічым не затуманенага таленту. У ёй шчасліва спалучаюцца дапытлівы розум даследчыка, які пастаянна ў пошуку, і цвярозы разлік практыка, які, не марудзячы, скарыстоўвае вынікі даследавання.

Як і папярэднія работы мастачкі, «Беларускае свята» — пра нашу вёску, яе каларыт, непаўторныя характары. Мабыць, гэта ў мастачкі надоўга. Па-ранейшаму простыя, немудрагелістыя сюжэты. Часцей за ўсё проста партрэты людзей, якія спадабаліся, або маляўнічая група фігур, не звязаных якімсьці пэўным дзеяннем. Мастачку цікавіць не тое, што яны робяць, а як яны выглядаюць. Перадаць словамі тое, **што** «адбываецца» ў «Беларускім свяце», досыць проста — пра гэта гавораць ужо назвы лістоў: «Музыкі», «Хор», «Запявала»... Але вось **як яны спяваюць** і **іграюць** — трэба бачыць самому. Мастачка гэта бачыць, і ў яе ўмельстве перадаць бачанае, адчутае — адзін з сакрэтаў абаяння яе творчасці. А. Паслядовіч свядома ідзе на складаныя, падчас грувасткія і працяглыя вопыты, каб урэшце рэшт вывесці гранічна простую, ясную і выразную «формулу» сапраўднай графікі. «Беларускае свята» — эксперымент вельмі цікавы, але, напэўна ж, далёка не канчатковы.

Творчыя знаходкі бачым мы ў рабоце графіка Н. Паплаўскай — мастачкі з тонкім густам, якая працуе побач з Г. Паплаўскім і адчувае яго дабратворны творчы ўплыў (а, можа, наадварот?). Душэўнай шчодрасцю і цеплынёй, нейкай асаблівай дабратой авеяны яе новыя работы, створаныя па ўражаннях ад нядаўняй паездкі па беларускім Палессі: «Размовы» і «Нядзеля». Гэтыя лісты, прасякнутыя шчырым лірызмам, поўныя яшчэ і вясёлага, добразычлівага гумару. Але чым асабліва захапляешся ў творчасці Н. Паплаўскай — дык гэта яе цудоўным веданнем псіхалогіі нашага «маленькага сучасніка», яе здольнасцю ўспрыняць свет у тых «вымярэннях», у якіх яго ўспрымаюць дзеці. Ведучы з дзецьмі змястоўныя размовы на складанай мове мастацтва, яна не «сюсюкае», ставіцца да юнага сучасніка па-сур'ёзнаму («Музыка-чараўнік»).

Пра жыццё беларускай вёскі (не толькі сучаснай) гавораць многія ўдала вырашаныя графічныя лісты, такія, як, напрыклад, «Маё дзяцінства» С. Геруса, «Алеся» і «Вяскоўцы» Б. Малкіна, «Трубы трубяць гарадзенскія» Л. Налівайкі, ілюстрацыі Г. Паплаўскага і іншыя.

ЁСЦЬ на выстаўцы і творы, прысвечаныя беларускай старажытнасці. Эпізоды далёкага мінулага, пераламляючыся ў свядомасці мастакоў, паўстаюць перад гледачом у новым, непаўторным аблічччы, у яркай, часам нечаканай інтэрпрэтацыі. Хаця, бывае, можна сустрэць у такіх работах і павярхоўнае любаванне «экзотыкай гістарычнага», і неапраўданую стылізацыю. Але каштоўнае ўжо само імкненне «авалодаць» культурна-гістарычнымі каштоўнасцямі роднага народа, паставіць іх на службу сучаснасці.

Сярод гэтых твораў выдзяляецца свежасцю падыходу да тэмы, якойсьці літаральна «ашаламляльнай» верагоднасцю вобразаў віртуозна выкананы гуашавы трыпціх Ю. Нікіфарава «Слова аб палку Ігаравым». І ўсё ж вельмі хочацца спытаць у аўтара: што гэта — станковы твор або ілюстрацыі да «Слова», а можа проста эскізы тэатральнай пастаноўкі?.. У любым выпадку кожны з відаў і жанраў выяўленчага мастацтва мае свае асаблівасці, з якімі мастак не можа не лічыцца. Занядбанне гэтымі асаблівасцямі немінуча параджае эклектычнае спалучэнне элементаў розных відаў і жанраў у адным творы, як гэта здарылася ў трыпціху Ю. Нікіфарава (паўтараю — у таленавітым).

З НАЁМЯЧЫСЯ з экспазіцыяй графікі, бачыш вельмі многа эксперыментаў — удалых (як, напрыклад, у Г. Паплаўскага і А. Паслядовіч) і няўдалых або, прынамсі, спрэчных.

Вопыты маладога віцебскага мастака В. Ральцэвіча, яго пошукі ў самой структуры тэхнікі акварэлі, на мой погляд, здольныя прынесці мала плёну. Я маю на ўвазе яго ліст «Вайна скончылася». Акварэль — «вадзяныя фарбы» — самая старажытная, самая тонкая тэхніка. Ёй вельмі шкодзіць усялякае адхіленне ад ужо даўно знойдзеных і замацаваных у работах лепшых майстроў акварэлі прыёмаў. А якраз такія адхіленні перш за ўсё кідаюцца ў вочы, калі глядзіш работу В. Ральцэвіча. Недаацэнка магчымасцей акварэлі відавочная і ў Ф. Гумена. Напэўна ж, не вельмі добра, калі на белым лісце паперы мастак піша гэткім «дабротным» жывапісам, занядбаўшы самыя каштоўныя якасці акварэльнай тэхнікі («Нацюрморт. Хлябы»).

Здольнасць любой графічнай тэхнікі быць самой сабой павінна, на мой погляд, не замінаць, а памагаць у вырашэнні той ці іншай творчай задачы. Паглядзіце, з якім майстэрствам дабіваецца вобразнага ўздзеяння, напрыклад, адзін са старэйшых майстроў афорта Л. Ран. Майстра, мабыць, не бянтэжыць надта традыцыйная «класічная» мова яго серыі афортаў, прысвечаных архітэктурным помнікам рэспублікі. Формула «што і як адлюстроўваць» бліскуча ўраўнаважана тым беспамылковым пачуццём выяўленчых сродкаў, якое ўвогуле характэрна для майстроў старэйшага пакалення. Аднак, як гэта часта бывае, арганічна ўласцівая мастаку манера тоіць у сабе небяспеку ператварыцца ў пэўную схему — стаць перашкодай на шляху да вялікіх творчых здзяйсненняў. Іменна па гэтай прычыне, нягледзячы на дакладнае прымяненне прыёмаў тэхнікі афорта, у некаторых лістах Л. Рана праглядвае абыякавасць мастака да таго, што ён адлюстроўвае.

НЯГЛЕДЗЯЧЫ на разнастайнасць тэматыкі і стылявых пошукаў заўважаеш і пэўныя недахопы экспазіцыі ў цэлым.

Перш за ўсё гэта датычыць вобраза нашага сучасніка. У паказе яго няма пэўнай «генеральнай лініі». Пры вырашэнні вобраза сучасніка (як мы ўжо бачылі, разглядаючы лепшыя творы аб ім) пераважае быт, этнаграфізм. Пульс жа сучаснасці — напружанае духоўнае жыццё чалавека другой палавіны дваццатага стагоддзя, разнастайнасць яго інтарэсаў і сфер дзейнасці — пакуль што не ўвасоблены нашай графікай дастаткова поўна.


Прыкметным становіцца «выцясненне» з твораў графікі жыццёвай напоўненасці — вобразы гэтых твораў з'яўляюцца не столькі ад непасрэднага судакранання з жыццём, колькі ў выніку мастакоўскага, назапашанага раней, вопыту. Вобразы вар'іруюцца чыста разумова — завучаным прыёмам.

У лепшых графічных работах выстаўкі выразна адлюстраваліся сённяшнія праблемы творчасці. Графікам зразумелыя задачы, якія стаяць перад савецкім мастацтвам.

На парадку дня ў іх — надзённейшае: усебакова, глыбока раскрыць у высокамастацкіх творах інтэлектуальны свет сучасніка. Нашым графікам пад сілу такая задача. Пра гэта сведчаць культура творчасці, валоданне прафесіянальным майстэрствам, у якіх мы пераканаліся яшчэ раз на юбілейнай мастацкай.

Сяргей ПЕТЭРСОН.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ СТАРОЙ КАМЕДЫІ



Яшчэ ў дваццатыя гады шырокай папулярнасцю карысталася ў Беларусі вясёлая камедыя Е. Міровіча «Каваль-ваявода». Народны тэатр Палаца культуры прафсаюзаў даў новае жыццё камедыі Е. Міровіча. Днямі адбылася прэм'ера гэтага вясёлага кірмашу-радаснага спектакля. Рэжысёр-пастаноўшчык К. Кулакоў, мастацкае афармленне М. Кургановіч, музыку напісаў кампазітар заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі Ю. Семяняка. Ролю Ваяводы выконвае Ю. Марціневіч, Каваля — І. Доўгіх, Блазна — І. Шпілеўскі, Доктара — А. Хадароўскі. У спектаклі таксама ўдзельнічаюць Г. Сінякоў, М. Аўдзей, М. Дрыжынскі, М. Мазурэнка і іншыя.

У спектаклі многа песень, музыкі, масавых сцэн. У ім заняты самадзейныя калектывы Палаца культуры — народны маладзёжны хор, студыя класічнага танца і народны ансамбль танца «Вясёлка».

На здымку — сцэна са спектакля.

Фота У. КРУКА.

ТЭАТР

ДАЛЁКАЕ—БЛІЗКАЕ

«ПРАЗ СТО ГАДОЎ У БЯРОЗАВЫМ ГАІ» Ў БРЭСЦКІМ ТЭАТРЫ імя ЛКСМБ

ПРАЗ СТО ГАДОЎ. Гэта нерэальны час для жывых. Сузяшальная рамантычная мара замест жорсткага цвярозага «ніколі». Князь Аленскі і Эліз Чарамісава ніколі не сустрэнуцца, але хочацца верыць, што людзі і лёс паўтараюцца. Пройдзе больш чым сто гадоў, і двое, вельмі падобныя на тых, выйдуць да нас у глядзельную залу і раскажуць аб людзях, якія згарэлі, як свечкі, аб кароткіх жыццях, якія ярка асвятлілі змрочную чарнату часу.

Спектакль Брэсцкага тэатра імя ЛКСМ Беларусі па п'есе В. Карастылёва «Праз сто гадоў у бярозавым гаі» толькі ў пралозе парушае храналагічную паслядоўнасць аўтарскага апавядання. Выходзяць двое акцёраў. Пазней яны будуць іграць Эліз і Аленскага. Выходзяць, каб перадаць нам кароткі роздум аўтара пра эпоху, у якую жылі дзекабрысты. «Праўда — гэта ток высокага напружання. Ток крыві дзекабрыстаў быў токам высокага напружання».

Яны пойдуць у цемру куліс, асвятляючы свечкай свой шлях. І адразу ж загарацца свечкі ў пазалочаных кандэлябрах. Свечкі назойліва і сімвалічна будуць свяціць нам праз увесь спектакль. Спачатку рэжысёр спектакля Г. Баравік і мастак А. Марозаў будуць фармальна прытрымлівацца аўтарскай рэмаркі: «Калі гэта п'еса ўзнікла ва ўяўленні, дык спачатку ўзніклі свечкі, а потым ужо твары. Свечкі былі розныя— ад агарка ў старажытным падсвечніку да свечак-сімвалаў, свечак-гігантаў. Свечкі загараліся і асвятлялі людзей».

Няхай усё будзе так, як бачыцца аўтару. Гэта не толькі не перашкаджае галоўнаму, а, наадварот, падкрэслівае таямніча-рамантычную атмасферу змовы. Хутка цяжкія вітыя свечкі на фоне чорнага аксаміту перастанеш заўважаць — застануцца толькі людзі. Яны крышку старамодныя, падкрэслена прыгожыя і зухавата безразважныя.

Бадай, манера паводзін запазычана з таго стогадовай даўнасці часу: непаспешлівасць і важнасць цырыманіялу, урачысты адбор слоў для вялікасвецкай гутаркі. Яркае сукно мундзіраў, парча і пазалота зноў і зноў падкрэсліваюць, што дзея адбываецца ў мінулым стагоддзі.

Але вось артысты загаварылі і імгненна перакінуўся масток у нашыя дні, да нас, хто зараз у глядзельнай зале. Менш за ўсё акцёры адчуваюць сябе дзекабрыстамі, іх саюзнікамі і іх катамі: ні на хвіліну не прападае адчуванне таго, што гэта нібы кожны з нас на сябе прымераў мундзір або кайданы тых людзей.

Можа варта і стрымацца ад паспешлівых ацэнак, але вельмі хочацца адразу ж заявіць, што ў спектаклі многа цікавых людзей, яркіх, складаных, непаўторных. І ў першую чаргу, гэта Спяранскі (Б. Уксусаў) і Горын (Ю. Уласаў).

Спяранскага, чалавека вялікага розуму і вялікага палітычнага таленту, дзекабрысты мелі на ўвазе кандыдатам у будучы ўрад. Гаварыць са Спяранскім даручана Горыну.

СПЯРАНСКІ. Ад каго даручэнне, падпалкоўнік?

ГОРЫН. Ад яе вялікасці Свабоды Расійскай.

СПЯРАНСКІ. Дзіўнае даручэнне ад неіснуючай вялікасці.

ГОРЫН. Сапраўды так, Міхал Міхалыч. Але ёй у цяперашнім міжцараванні ўзысці б на трон.

Спяранскі — Уксусаў робіць крок ад Горына, нібы адмярае дыстанцыю ў становішчы, розніцу ў поглядах, адразу ж адмяжоўваецца, але ўсё яшчэ працягвае заігрываць.

СПЯРАНСКІ. ...Не магу паверыць, што чутка аб тайных таварыствах, ад якой, нібы ад дыму, чад цяпер ва ўсіх кутках, аказалася яўнай.

У вуснах Уксусава гэта не падазрэнне і не абвінавачанне, а нечаканая здагадка, якая раптам яго ўзрадавала. У тоне і захапленне смельчаком, і боязь стаць саўдзельнікам.

Але Горын, на ўсякі выпадак, можа ўсё яшчэ на нешта спадзеючыся, на развітанне гаворыць Спяранскаму: «...Рады, што паміж намі здарылася супадзенне думак і патрыятычных пачуццяў...» Потым Рылееў вызначыць сэнс гэтай гутаркі больш дакладна: «Пабаяўся сказаць «так», але і «не» таксама пабаяўся сказаць».

Артыст Б. Уксусаў сыграў сцэну так, нібы Спяранскі ў глыбіні душы захоўвае надзею на магчымы добры зыход бунту і цешыць сябе надзеяй заняць пост у новым урадзе. Таму ён не сказаў «рэвалюцыяністм» **«не».**

Але вось вялікі князь падпісвае маніфест і становіцца царом Мікалаем. Першы відавочца гэтай падзеі Спяранскі. Ён не ўтойвае, што рады такому выніку падзей. Спяранскі ўздыхнуў з палёгкай, супакоіўся і нават дазволіў сабе нейкую фамільярнасць. Новаспечаны цар (У. Пестуноў) імгненна вырашыў праверыць свайго бліжэйшага памочніка: «Міхал Міхалыч! Дык ты ж цяпер не вялікаму князю, а гасудару імператару выгаворваеш! Адкуль смеласць узяў?»

Спяранскі імгненна панік. Што ж, бунтаўшчыкам цяпер не ўзяць верху, але і пры цары яму соладка не будзе. Між іншым, Спяранскі ўпэўнены, што пры любым выніку ён, відаць, нічога не прайграе. Яго розум вельмі высока цэняць і сябры і ворагі. Але пры цары, бадай, спакайней. Пад царом хадзіць больш надзейна.

Але пакінем ненадоўга Спяранскага і заглянем у лагер змоўшчыкаў.

Кватэра Рылеева. Ноч напярэдадні паўстання. У апошні раз сябры горача гавораць пра лёс Расіі. Заўтра вызначыцца іх уласны лёс і іх роля ў гісторыі.

Рылееў (В. Банцін) гарачы і нецярплівы: «Міша, як ты думаеш, ці стане заўтрашні дзень гістарычным для Расіі?». Горын настроены скептычна: «Калі ўдала навострым шаблі, дык і стане». Заўважым, што гэтая фраза перашкаджае акцёру Ю. Уласаву іграць веру ў сур'ёзнасць і адказнасць таго, што адбудзецца заўтра, бо пазбаўляе Горына святога хвалявання. Але пазней пачынаеш разумець сэнс такога адхілення.

Разам з Аленскім і Эліз аўтар у пралогу выводзіць Горына і слугу Антона. Гэтым чатыром персанажам суджана сустрэцца праз сто гадоў у бярозавым гаі. І таму іменна ў іх вусны ўкладзены ўсе словы роздуму аб сувязі эпох. Горын як бы «наш чалавек» у тым часе. Яму смешныя словы Рылеева аб тым, што «галоўнае для рэвалюцыяніста — не забіць лебедзя ў душы». Рылееў і Аленскі чакаюць ад бунту перш за ўсё рамантыкі. А Горын гаворыць: «Мы ідзём не іграць, а выпускаць кішкі на брудны брук... Кроў будзе не чырвоная, рамантычная, а брудная, змешаная са снегам і конскім гноем». Ён нібы прадчувае, што пазней цар паспрабуе скампраметаваць дзекабрыстаў, даказаць, што яны, ідучы на святую справу, не былі святыя. Горына мучыць, што ва ўсіх іх вельмі прыгожыя мундзіры. «Не паўстанне, а парад фарбаў. Нібы для Брулова стараемся».

Яго сумненні падтрымаюць у сваіх частушках з'едлівыя скамарохі:

> «Детушкам — ладушки,
> Детушкам—баиньки,
> А холоп снаряжал
> На восстанье барина».

Адкуль яны ўзяліся гэтыя ўсёведныя каментатары? На іх блазенскія каўпакі і каптаны. Вочы злосныя і песні ў іх вельмі смелыя. Спяваюць яны іх то цару, то князю, то мужыку і нікога не баяцца.

Выхады скамарохаў добра прадуманы рэжысёрам і таленавіта сыграны акцёрамі А. Самаравым, А. Беражным і В. Лісоўскім. Скамарохі падводзяць рысу першай частцы спектакля і даюць запеў другой.

Але тут зноў давядзецца вярнуцца да Спяранскага. Я вызначыла б першыя карціны другога акта як гісторыю падзення Спяранскага. Асветнік памяняўся месцам з жандарам. Між іншым, асветнік яшчэ не прызнаў свайго падзення, ён спрабуе ўхіліцца ад допытаў, застацца чыстым перад гісторыяй. Паядынак Спяранскага і Мікалая пабудаваны ў спектаклі як ланцуг здрадлівых учынкаў адукаванага розуму, купленага за права ўладарыць над іншымі.

Цар не можа дапусціць, каб дзекабрысты ўвайшлі ў гісторыю як героі. Яму хочацца, каб нашчадкі маглі высекчы мёртвых шпіцрутэнамі! Як бы ўтоіць ісціну і перапісаць гісторыю? Мікалай прымушае Спяранскага ўголас выказаць царскую думку — няхай кожны з дзекабрыстаў зробіць подласць і з тым прадстане перад судом нашчадкаў. І Спяранскі сфармуляваў. Спяранскі —Уксусаў ашаломлены ўласнай подласцю. Ён зрабіў гэта імпульсіўна, але цяпер ужо няма звароту назад. Яго далейшыя паводзіны прадвызначаны радасным уздыхам палёгкі, калі Мікалай падпісаў маніфест.

Цар разлічвае на тое, што погляды і перакананні Спяранскага, яго рэпутацыя свабодалюбца адгародзіць трон ад усякіх падазрэнняў. Думку пыхлівага асветніка не цяжка паставіць на службу рэакцыі. Тут Б. Уксусаў іграе моцнага чалавека, які зламаўся. Не сагнуўся, а зламаўся. Мікалай настаўляе яго: «Будзь мяккі ў допытах, будзь з філосафам — філосаф, з паэтам—паэт».

Спяранскі—Уксусаў усё-такі не здолеў заглянуць у вочы былым сябрам, ён прадэманстраваў ім сваю віну і, прыніжаны гэтым яшчэ больш, сарваўся да рукапрыкладства. Усё ніжэй схіляючы галаву, з сорамам пацвярджае гэты асветнік, што Песцеля і Булатава жорстка катавалі. І тут жа спрабуе апраўдацца тым, што сам ён «да катаванняў цялесных не мае адносін». Але, калі Горын быццам ненаўмысна называе Спяранскага Бенкендорфам, нервы здаюць, і яшчэ адно звяно ў ланцугу здрад замыкаецца. І наступнае звяно — па загадзе цара Спяранскі просіць у Горына прабачэння за рукапрыкладства. І, нарэшце, апошняе — Спяранскі і жандар, зноў-такі па загадзе цара, здымаюць кайданы з Аленскага, каб праз гадзіну зноў надзець.

Цяпер самалюбства асветніка зламана канчаткова. Сарваны ўсе маскі: Спяранскі голы перад гісторыяй.

Што ж, з такім сапернікам цікава было змагацца і цару, і Горыну. З такім моцным партнёрам заўсёды цікава сустракацца на сцэне. Нездарма менавіта ў сцэнах са Спяранскім найбольш цікавы Мікалай. Акцёр У. Пестуноў іграе страсна і выразна, але няроўна, не заўсёды выкарыстоўвае да канца багатыя магчымасці ролі. Не ўдаўся акцёру маналог Мікалая аб сэнсе царавання.

«Цар. Цараваць. Царыць. Царэнне. Царства...» Мікалай выклікае цені Грознага, Гадунова, Пятра Першага. Чым моцныя яны былі? Страхам.

«Улада — кінжал», —прадказвае Іван Грозны. Пётр Першы папярэджвае:

> «России бойся, государь!
> России!
> Ее иль на дыбы, или на дыбу—
> Иного нет исхода для нее!»

На жаль, у акцёра тут не роздум над мінулым, над сэнсам улады і жорсткасці, якую яна нараджае, а проста асалода неразумнага чалавека, які дарваўся да запаветнага. Замінае акцёру «прасцецкасць» яго мовы і цяга да позы.

Вось сцэна з Растоўцавым (А. Чарноцкі). Захоплены юнак раскрывае цару змову. Яго шчырасць падкупіла тое, што Мікалай «больш як два тыдні адмаўляўся ад кароны, хоць меў і ўладу, і права неадкладна надзець яе на сябе». Растоўцаў не хоча, каб Расія падзялілася на расіян, якія б стралялі адзін у аднаго. Ён не здраджвае, а імкнецца выратаваць змоўшчыкаў. Артыст А. Чарноцкі іграе яго як пакутніка праўды, які сумленна глядзіць усім у вочы. Гэта адзін з тых «бедных хлопчыкаў Расіі, якія заўсёды гатовы за штонебудзь памерці». Ён, як і Рылееў, шчыра песціць свайго лебедзя ў душы: Растоўцаў здраджвае ў хвіліну афекта. Адзіная правільная для такога Растоўцава царская ўзнагарода — не грошы, не тытул, а царская дружба! Цар — Пестуноў выкрэслівае Растоўцава са спіса змоўшчыкаў, праяўляе сваю высокую царскую літасць. А як бы цікава мог сыграць той жа У. Пестуноў разумнага ўладара, які паступова вярбуе сабе раба! Гэта не сыграна...

Рэжысёр спектакля добра дапамагае акцёру ў фінальнай сцэне. Не дамогшыся жаданага, Мікалай... ломіць крэслы, на якіх павінны былі сядзець ненавісныя яму дзекабрысты. Кідае крэслы ў кучу, трушчыць іх, нібы расправіліяецца фізічна са змоўшчыкамі. Чырвонае святло залівае сцэну. Манатонныя крыкі жандара і звон бразготак, кашмарны хаос... Зблытаны ўсе паняцці пра дабро і зло.

Рыса гэтаму прадстаўленню падводзіцца хрэстаматыйнымі словамі Гогаля: акцёр А. Логінаў выходзіць на сцэну і са смуткам глядзіць на тое, што адбылося,— узнікае маналог «Птушка-тройка».

Так, Русь перажыве і гэта. У яе наперадзе яшчэ і не такія навальніцы! І якая цудоўная будучыня чакае яе праз сто гадоў.

Тэатр прапануе гледачу ўспомніць гістарычныя факты і лёс людзей, падумаць пра ўрокі мінулага, пра гераізм тых, хто заўсёды потым быў павучальным прыкладам для рэвалюцыянераў Расіі: «Іх справа не прапала», — гэта словы У. І. Леніна. У такім спектаклі вельмі важна было захапіць залу характарам відовішча, атмасферай дзеяння, пераканаўчымі вобразамі. Разам з эстэтычным уздзеяннем тэатр павінен быў выканаць і задачы выкладчыка гісторыі, які не ілюструе старонкі мінулага, а дае іх паэтычнае асэнсаванне. Да гонару тэатра імя ЛКСМБ трэба аднесці тое, што калектыў разумеў гэта і часцей за ўсё добра спраўляецца з такой незвычайнай задачай: ён вучыць, захапляючы. Вучыць глядзець на гісторыю свежымі вачыма.

Таццяна АРЛОВА.

БЕЛАРУСКАЯ АКВАРЭЛЬ У МАСКВЕ

Як вядома, у сакавіку гэтага года ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве адкрыецца другая Усесаюзная выстаўка акварэльных работ. У ёй прымуць удзел мастакі ўсіх саюзных рэспублік.

Журы адабрала для выстаўкі каля 700 лепшых работ з творчых саюзаў Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдавіі, Узбекістана, Прыбалтыкі і іншых братніх рэспублік. Сярод іх 23 акварэлі трынаццаці беларускіх мастакоў. Гэта работы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР А. Паслядовіч, мастакоў Г. Вашчанкі, Г. Ціхановіча, В. Цвірко, Ф. Гумена, Л. Лейтмана, Я. Іванешкі, М. Кірылава, А. Толкача, В. Ральцэвіча, В. Сахненкі, І. Капляна і В. Шутава.

У акварэлях беларускіх мастакоў — прырода роднага краю, індустрыяльныя пейзажы сучаснага горада, а таксама тэмы працы, быту, адпачынку. Сярод адабраных на выстаўку ёсць творы пад умоўнай назвай «Героі нашага часу». Яны прысвечаны перадавікам вытворчасці, Героям Сацыялістычнай Працы, грамадскім дзеячам.

Беларуская сучасная акварэль выклікала вялікую цікавасць у членаў журы.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ



Л. АСЕЦКІ. З серыі «Мінскае падполле» (лінагравюра)—«1941 год», «Да зброі!», «Аднагалосна».

ВЫДАЎЦЫ ПАДВОДЗЯЦЬ ВЫНІКІ РАБОТЫ

У Мінску адбылася нарада работнікаў выдавецтваў і кніжнага гандлю рэспублікі, на якой падведзены вынікі іх дзейнасці ў 1968 годзе і вызначаны задачы па далейшаму ўдасканаленню кнігавыдавецкай справы, паляпшэнню прапаганды і распаўсюджванню кніг сярод насельніцтва. З дакладам выступіў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку А. Барушка.

Мінулы год, як адзначалася на нарадзе, быў плённы для выдавецтваў «Беларусь», «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «Ураджай» і «Навука і тэхніка». Усе яны паспяхова выканалі свае планы. Тэматыка выданняў разнастайная. Гэта — палітычная, навуковая, вучэбная і мастацкая літаратура, выяўленчая прадукцыя.

Сярод гэтай літаратуры асобае месца займаюць выданні, прысвечаныя 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Да юбілею рэспублікі выйшла з друку звыш 50 работ, большасць з якіх — арыгінальныя.

Выдавецтвы і прадпрыемствы паліграфіі дасягнулі значных поспехаў у мастацка-тэхнічным і паліграфічным выданні кніг. На рэспубліканскім конкурсе прысуджаны дыпломы 64 работам мастакоў, якія афармлялі выданні 1968 года.

На нарадзе была ўдзелена вялікая ўвага арганізацыі паспяховага выпуску літаратуры, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Вялася таксама гаворка аб неабходнасці пашыраць тэматыку выданняў, палепшыць работу кнігагандлёвых арганізацый рэспублікі і, перш за ўсё, па збору заказаў на новую літаратуру.

АЛЬБОМ ПЛЯМЕННІКА БУНІНА

Жыве ў Бабруйску Мікалай Іосіфавіч Ласкаржэўскі — пляменнік Івана Аляксеевіча Буніна. Мікалай Іосіфавіч добра памятае тыя дарэвалюцыйныя гады, калі сям'я іх жыла ў горадзе Яфрэмаве. Туды, у Яфрэмава, часта наведваўся пісьменнік. Ён прыязджаў да сваёй малодшай сястры Марыі Аляксееўны — маці Мікалая Іосіфавіча. Гэтыя сустрэчы засталіся ў памяці на ўсё жыццё. У Мікалая Іосіфавіча захаваліся некаторыя асабістыя рэчы сям'і Буніных, рэдкія фотаздымкі. У апошнія гады ён працуе над альбомам, прысвечаным жыццю Івана Аляксеевіча і яго родзічаў.

Нядаўна я меў магчымасць пазнаёміцца з гэтым альбомам. Першы раздзел у ім прысвечаны жыццю і творчасці самога Буніна. Іншыя раздзелы расказваюць аб жыцці братоў пісьменніка — Юлія Аляксеевіча і Яўгена Аляксеевіча. Апошні раздзел прысвечаны Марыі Аляксееўне.

У альбоме звыш 400 фатаграфій, з іх амаль 300 датычаць непасрэдна Івана Аляксеевіча Буніна. Ёсць тут і генеалагічная схема сям'і Буніных. Усё гэта, несумненна, уяўляе цікавасць для даследчыкаў жыцця і творчасці вялікага рускага пісьменніка.

Мікалай Іосіфавіч часта бывае ў бібліятэках горада, прымае ўдзел у літаратурных вечарах і канферэнцыях, выступае перад чытачамі з успамінамі пра Івана Аляксеевіча, з якім ён неаднойчы сустракаўся.

Л. ФАДЗЕЕЎ.

ТВОРЧАСЦЬ ПАЧЫНАЮЧЫХ

Рэдакцыя Ляхавіцкай раённай газеты «Будаўнік камунізма» падвяла вынікі конкурсу на лепшы верш, нарыс і фотаздымак сваіх чытачоў. Першую прэмію за верш «Беларусі» атрымаў інспектар райана, старшыня раённага літаб'яднання Кастусь Турко. Другая прэмія за верш «Мінску» прысуджана адказнаму сакратару раённага аддзялення таварыства «Веды» Вікторыі Міхайлоўскай.

Адным з пераможцаў конкурсу стаў і настаўнік Зубелевіцкай васьмігодкі Васіль Сокал. За нарыс «Сонечныя далі» яму прысуджана другая прэмія.

Заахвочвальныя прэміі ўручаны настаўніцы Падлескай школы Марыі Каляда за верш «Камсамолу» і фотааматару — электрыку раённага Дома культуры Казіміру Касцючэнну за серыю здымкаў «Край мой родны».

М. ШАВЕЛЬ.

ПА П'ЕСЕ СВАЙГО ЗЕМЛЯКА

Драматычны калектыў Пухавіцкага раённага Дома культуры паказаў спектакль па п'есе свайго земляка В. Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі». (Два гады назад гэты спектакль паставілі самадзейныя артысты Мар'інагорскага сельскагаспадарчага тэхнікума).

Спектакль у новай пастаноўцы карыстаецца поспехам у гледача. Яго прагледзела ўжо больш тысячы чалавек — жыхары Мар'інай Горкі, навучэнцы тэхнікума, хлебаробы калгаса імя 16 чырвоных партызан — радзімы дукорскіх герояў і іншыя. Цёпла прымалі спектакль удзельнікі чарговага вечара, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

На чарзе — сустрэчы з гледачамі Чэрвеньскага і Уздзенскага раёнаў.

А. ЯРОХІН.

НАДРУКАВАНА ў «Полымі»

ШТО ТАКОЕ ЦУНАМІ?

Новая паэма Аркадзя Куляшова

„Цунамі — гэта гіганцкія хвалі, якія ўзнікаюць на паверхні акіяна ў выніку моцнага падводнага землетрасення. Хуткасць распаўсюджвання цунамі ад 400 да 800 кіламетраў у гадзіну. Вышыня хваль каля прыбярэжных скал і ў вузкіх частках рачных далін дасягае 15—30 метраў. Абрушваючыся на нізкі бераг, цунамі могуць пранікаць далёка на сушу і прыносяць вялікія разбурэнні. Назіраюцца галоўным чынам каля берагоў Ціхага акіяна» («Кароткая геаграфічная энцыклапедыя»).

...*Ён і яна накіраваліся* з веку дваццатага ў век дванаццаты. Яны вырашылі,

Пакінуўшы шумлівы свет *людскі*,
Не шкадаваць аб ім. На маякі
Не спадзявацца. Не лічыцца з часам.
. . . .
Прайсці самім адлегласць ад таемных
Пячорных знакаў да лемантара.

Але нашы падарожнікі марылі не толькі аб тым, каб павярнуць у мінулае сваю «пірогу». Яны марылі аб тым, каб абыйсціся без забытых імі «вырабаў зямлі»:

Тут кожны быць павінен сам сабой,
Як смага—смагай, а вада—вадой.

У акіяне ён і яна сустракаюць падарожнага — не то нашчадка, не то продка іх. За вады крынічнае глыток падарожнік

Прыёмнік аддаваў—надзейны сродак,
Каб дапамогу выклікаць здалёк,
Альбо, калі таго жадаюць самі,
Стаць радыёгадзіннікам для іх,
Альбо ад пільных служб берагавых
Прыняць паведамленне аб цунамі...

Яны не ўзялі прыёмніка, ім не патрэбна дапамога — «хай п'е ваду крынічную нябога».

І яшчэ аб большым марылі ён і яна: выкінуць гадзіннік, страціць уяўленне аб часе...

Тэма часу, гадзінніка — традыцыйная для Куляшова. Чытач памятае, што Алесь Рыбка з паэмы «Сцяг брыгады», пакідаючы Мінск, сярод самых неабходных рэчаў, узяў з сабой і гадзіннік, бо хацеў убачыць час перамогі на яго цыферблаце.

З часу з'яўлення ў канцы 40-х гадоў першых «касмічных» твораў А. Куляшова—а яны з'явіліся задоўга да касмічных палётаў—праблема прасторы і часу дужа хвалюе паэта. Настолькі хвалюе, што і свой асабісты лёс паэт звязвае непасрэдна з гэтай праблемай, ён як бы жыве ў новых і нязвыклых для зямлян уяўленнях аб часе:

Праз дзесяць год ты з'явішся з-за хмары,
Закончыўшы касмічны свой палёт,
А на зямлі, па вылічэнню мары,
Гадоў міне не менш, як восемсот.
Не знаю я, што, прыляцеўшы з неба,
Вачыма новых дзён убачыш ты,
А толькі не шукай, шукаць не трэба,
Сярод магільных пліт маёй пліты.
Лепш завяжы любімую хусцінку,
Сатканую з праменяў і нябёс.
І хай нясе цябе, маю дзяўчынку,
На лёгкіх крыльцах неўміручы лёс.

Гэты верш пісаўся нядаўна, але ён ужо гучыць як класічная элегія пра будучыя ростані закаханых...

Падарожныя з паэмы «Цунамі» выкінулі гадзіннік за борт, бо хацелі на лодцы пераехаць з лета ў лета, з вясны ў зіму і «лік згубіць гадам».

Вось, здаецца, яны ўжо шчаслівыя: удваіх плывуць яны да часу першабытнага, і адно ў іх сонца на дваіх. Але ад сучаснасці не так лёгка ўцячы.

Сюжэтна найбольш істотным момантам паэмы з'яўляецца расказ аб атамным выбуху, які паўстаў на шляху нашых падарожнікаў. Тут Аркадзь Куляшоў метадам, запазычаным з кінамантажу, вяртае нас да сучаснасці. Ён гэта робіць, сцвярджаючы, што

Ветразі дванаццатага веку
Сустрэчным ветрам век дваццаты рве.

Ратуючыся ад выбуху, паруснік трапляе на неабжытую выспу. І вось ён ужо Рабінзон, а яна — Пятніца, і ўсе спакусы і трывогі нашай сучаснасці здаюцца зноў *далёка*. Аднак шчасця і тут няма, і цяжкія думы зноў прыгнятаюць яго, бо на шляху да шчасця зноў стаў *успамін аб атамным выбуху*, які загубіў сотні шхун з рыбакамі.

І зноў яны ў дарозе, іх гоніць дакор. Наш герой шукае забыцця. Таго забыцця, якое дае доўгая адзінота ў акіяне, калі забываеш усё, часам нават, як сцвярджае адзін славуты мараплаўца, сваё імя і абставіны мінулага жыцця.

Але няма ўжо згоды паміж імі. Яна ўжо таксама адчула «чужы, салёны прысмак на губах», а «на душы — цяжкое прадчуванне няўхільных змен. Няшчасцяў. Бед ліхіх».

Яна імкнецца сэрцам да зямлі, якая ўвасобілася ў карабель, што праплывае міма:

Плыў, і спяваў, і весяліўся свет,
Навінаў поўны, кніжак і газет,
Людзей, якія з палуб іх віталі.

Карабель кінуў ім транзістарны прыёмнік. І зноў зямля з яе турботамі і клопатамі зрабілася «яблыкам разладу паміж імі», але згода была б дасягнута, калі б і тут не дагнала водгулле атамнага выбуху... Сын, які ў іх нарадзіўся, памёр... І гэта канчаткова вырашае лёс нашых герояў. Яны вяртаюцца ў вялікі свет, вяртаюцца не пасіўнымі сузіральнікамі, а змагарамі...

Вось такі сюжэт паэмы ў кароткім празаічным пераказе.

Не можа быць аднаго сюжэтнага тлумачэння паэме Аркадзя Куляшова. Гэта філасофскі твор пра час і пра месца чалавека ў ім.

Я. Брыль у дакладзе на пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі правільна адзначаў, што сэнс «Цунамі» выказаны ў радках, якія сцвярджаюць,

Што неспакой не лечыць адзінота,
Што адзіноту лечыць неспакой.

Але гэта сцвярджэнне не вычэрпвае шмат якіх больш істотных праблем твора.

Аркадзь Куляшоў пачынае з тэзісу аб тым, што зямля з'яўляецца яблыкам разладу не *толькі паміж* перадавымі і рэакцыйнымі грамадствамі свету, але і паміж асобнымі людзьмі, нават чалавека з самім сабой, *паколькі дыялектычна* супярэчлівая яго натура.

Ад таго, што іншыя вялікія светы сталі больш даступнымі, Зямля, *маленькая зялёная* планета, зрабілася яшчэ больш любай нам, яе насельнікам. У сваёй паэзіі Аркадзь Куляшоў даўно трывожыцца аб лёсе любай яго сэрцу планеты.

Ахопленую вадародным жахам,
Як хворую загортваю ў кумач,

Сачу, каб не скрануў яе з арбіты
Заакіянскі ядавіты грыб.

Так, з вялікім неспакоем, пісаў паэт у *«Новай кнізе»*. Выратаваць чалавецтва ад злавесных сіл імперыялізму, здольных на ўсялякае шаленства, — вось вырашальная праблема часу.

І тут пазіцыя Аркадзя Куляшова ясная, актыўная, партыйная. Кумач нашых сцягоў — гэта найлепшыя выратавальныя парусы для Зямлі, якая ў паэме «Цунамі» пераўвасоблена ў шхуну, што імчыцца па акіянскіх прасторах сусвету.

Уся паэма «Цунамі» ўяўляе з сябе надзвычай драматургічны, канфліктны па сваёй сутнасці твор. Кожная тэма мае сваю вострую, афарыстычна выказаную антытэзу.

Адразу ж на першую тэзу аб звароце з веку дваццатага ў век першабытны з'яўляецца антытэза. За плячыма падарожных устае так званы «цынік», які нашэптвае ім цвярозыя і праўдзівыя ісціны аб тым, што іх падарожжа для Зямлі не навіна і што яно можа вярнуць іх нечакана на той жа бераг. І затым «цынік» *яшчэ больш ускладняе* праблему: вы рвецеся з палону, «а хіба дасягнутае шчасце не палон?».

І ў другім месцы, калі ідылія паміж ім і ёй, здаецца, набыла ўжо незвычайную прывабнасць, зноў з'яўляецца «цынік» і пачынае бязлітасна выкрываць гэтую ідылію:

Вы на зямлі пакінулі гадзіннік,
Але гадзіннік не пакінуў вас.
Ён свой няўмольны лік вядзе вясне
І летнім дням—па сонечных гадзінах,
Дням восені глыбокай — па маршчынах,
Зімы суровым дням—*па сівізне.*
Яшчэ ніхто з яго дакладных рук
Хвіліны лішнія для вандраванняў
Не атрымаў. Не толькі для спатканняў
Ён існуе, але і для разлук.

Мы ўжо даволі выразна бачым, што не «цынік» перад намі, а разумны, паэтычна ўзнёслы чалавек, які з вялікім болем і спагадай ставіцца да герояў і голас якога нагадвае самога паэта, якому мастацкая інтуіцыя падказала, аднак, не зліваццa цалкам з гэтым мудрым антыподам герояў.

Сапраўды, хіба цынічным з'яўляецца сцвярджэнне аб тым, што «хто ў людным свеце жыў ад нараджэння, без страт няўхільных не пакіне свет»?

Усё, што гаворыць «цынік», ён гаворыць не проста, каб паспачуваць героям або асудзіць іх, а каб давесці бессэнсоўнасць і марнасць нейтралізму. І вось у паэме ўзнікае трохкутнік: ён, яна і яшчэ нехта трэці. Хто яны?

Наіўна і залішне даверліва было б бачыць у **ім** толькі паэта, а ў **ёй** толькі каханую, у трэцім ці то «цыніка», ці то музу, ці то сумленне, як растлумачвае нам сам паэт. Яна—гэта спакой, сцвярджае Куляшоў. Ён—неспакой, а нехта трэці—бязлітасная праўда жыцця. Дыялог паміж трыма датычыць, як сказана, часу і месца чалавека ў ім. Аўтар ставіць пытанне: дзе паратунак? У цывілізацыі ці антыцывілізацыі? Чым жыць—летуценнем альбо розумам? Імкнуцца за тым караблём, што праплыў міма, альбо, выкінуўшы транзістарны прыёмнік за карму, пачынаць усё спачатку, «памяць аднаўляць, каб зноў у лук яе ператварыць»? Чаго прыйшоў трэці?

— Каб ты не знаў спакою.
— А прагаю?
— З'яўляцца буду ў сне,
Зязюляй стану, ценем за спіною
Тваёй!.. Прагнаць не зможаш ты мяне!

Так, ценем стане. Мажліва, тым ценем, што застаецца нават пасля таго, як чалавек ужо загінуў, як гэта было ў Хірасіме, ценем, які будзіць людскі непакой.

Гэты трэці напамінае, што герой жыве ў век дваццаты, калі атамны выбух «трымае пад рэнтгенам» усё.

— Што можа лук—гаротнае дзіця,
Зрабіць, хаця б для самазахавання,
У час ліхі ўзаемапалявання,
Ракетадромаў смерці і жыцця?

Тут ужо канфлікт дaведзены да мяжы. Гэта грамадска спелая і бязлітасная формула ўвабрала ўсе супярэчнасці—паміж жыццём і смерцю, паміж цёмнымі сіламі свету і яго авангардам, паміж марай і явай, паміж спакоем і неспакоем, паміж каханай і героем, паміж уяўнай свабодай і неабходнасцю.

І ўзнікаюць цудоўныя радкі аб так званай несвабодзе, якая, па сутнасці, азначае адказнасць кожнага за лёс усіх:

Няхай палон! А хіба для насення
Пласт чарназёму—не такі ж палон,
Засек—не маўзалей?—пытаўся ён.
Яна маўчала, лежачы на сене.

Гэтыя радкі настолькі істотныя, што спрэчка на хвіліну сціхае, і паэт у вялікім натхненні так перадае гэты момант:

Бязмежны акіян— вячысты млын,
Малоў, як мелюць жыта, самавіта
Трывогі іх. Забыты напамін
Лясной вяшчункі. А за ім — забыта
Усё.

Важней за гэта нічога няма. Уяўную несвабоду творцы ад грамадства, несвабоду, якая падобна пласту чарназёма, захавае, сагрэе, напоіць сокамі зерне, з якога ўзыдуць парасткі новага жыцця і вялікай свабоды, славіць паэт.

І тут ужо канец складаным супярэчнасцям твора.

Гэта не сына на пустэльнай выспе дагнаў атамны выбух. «Чуў бацька ў крыках хлопчыка свайго крык рыбакоў, не ўстаўшых з дна марскога»; атамны выбух мог бы гэтак сама пахаваць усё, што дорага паэту: яго *каханне, яго паэзію, яго радасць* і боль, яго надзеі і трывогі. Вось чаму сына не адзін герой, «а ўся зямля павінна хаваць шматлюдным зборышчам сваім».

Ужо іншы тут, у заключных раздзелах паэмы, і герой паэмы. Вось што ён кажа аб сваім слове:

Хай не плітой чыгуннага ліцця
Яно гучыць. Хай ляжа, як насенне,
У грунт, з якога ўзыйдзе абурэнне —
Тваё непахаванае дзіця.

Дачасна мы хавалі дзіця героя. Яно не памёрла. Абурэнне, гатоўнасць змагацца за знішчэнне свету маны і атамнага шантажу—вось непахаванае дзіця паэта. І няхай бушуе шторм—нашы героі ўжо не *плывуць* на парусніку ў век дванаццаты дз цішыні. Назад, у грозны, велічны рэвалюцыйны дваццаты век, вяртаюцца яны

На рэактыўным лайнеры цунамі...
Ён бартавыя выключыў агні,
Маторы, што да мэты даляцелі,
І кінуў іх на бераг, як з купелі,
З пятнаццаціметровай вышыні.

І тут гэтая асацыяцыя падарожжа герояў з касмічным *палётам на караблі з шалёнай назвай* «Цунамі» не палохае паэта, бо ён моцна верыць у сілу мотораў, якія служаць гістарычнай справядлівасці і дабру.

Мы ўжо казалі аб шматпланавасці «Цунамі». Часам нават здаецца, што тут мы маем не мару аб падарожжы ў мінулыя вякі, што тут ідзе гаворка аб падарожжы ў краіну, якая называецца «Паэзія», туды, дзе творца застаецца сам-насам са сваёй песняй, дзе смага ёсць смага, а вада—вадою. І можа глыток крынічнай вады, за якую падарожны аддаваў прыёмнік, гэта глыток сапраўднай паэзіі...

Не раз ужо адзначалася, што з часу з'яўлення «Сцяга брыгады» А. Куляшоў мысліць вобразамі, якія да яго найчасцей сустракаліся хіба толькі ў паэзіі Янкі Купалы. Гэта вобразы маштабныя, пабудаваныя на нязвыклых супастаўленнях. Напрыклад, вобраз вялікай пякарні—вымалачанага нямецкімі танкамі поля ў «Сцягу брыгады». Касмічная эра ўвяла ва ўжытак новы слоўнік і дала яшчэ большы прастор для незвычайных супастаўленняў. Успомнім, напрыклад, той жа вобраз хворай зямлі, загорнутай у кумач, якую коціць паэт, ратуючы яе ад атамнай катастрофы.

Вобразы паэмы «Цунамі» больш стрыманыя, але такія, што даюць адчуванне вялікага абагульнення. Для разумення сутнасці твора, становішча героя, напрыклад, вялікае значэнне маюць радкі:

Яму ад кніжак, фільмаў і газет,
Як трэсцы ад агню, няма збавення.

Вось гэты бязлітасны сілагізм, які нельга ні адвергнуць, ні закрэсліць, з'ява аднachасова і старая і новая ў паэзіі Куляшова. Старая, бо мы сустракаем такое яшчэ ў творах часоў вайны. Новая, бо яна з'явілася ў выніку высокай кандэнсацыі думкі, мудрай сталасці.

Вобраз «як трэсцы ад агню, няма збавення» здаваўся нам беззаганным па сваёй дакладнасці, але Куляшоў узмацняе і яго:

Як тым запалкам ад свайго агню,
Ім ад саміх сябе няма збавення.

Далей ідзе вобраз—узор мэтанакіраванага скарыстання аднаго слова.

Дум не заменіць вам пасцель з травы,
Якой вы ўсё жытло сваё заслалі.
Калі яе салонай зробяць хвалі,
Аб чым тады **падумаеце** вы?

З аднаго боку, у першым радку праз адмаўленне сцвярджаецца, што ў герояў быў намер адмовіцца ад усялякіх **дум** аб жыцці, яны лічылі, што іх заменіць уяўны спакой—пасцель з травы. Але што вы зробіце, — пытаецца паэт,—калі пасцель зробіцца салонай, ды, можа, не ад хваль марскіх, а ад слёз? І тут нечакана і вельмі дарэчы зноў урываецца гэта слова: «*думка*», «*дума*»: «*Аб чым тады падумаеце вы?..*»

Гэтыя радкі нагадалі мне іншыя, з «Новай кнігі», дзе паэт выступае *майстрам*, які ўмее здабываць паэзію па-дзіцячы непасрэдна, канстатуючы самыя элементарныя супярэчнасці ў з'явах, у якіх цвярозы розум не бачыць ніякіх супярэчнасцей.

Вось пачатак верша:

Ужо даўно абрус зімовы
Сатлеў пад цёмнай ялінай...
А лес маўчыць...

Лес нямы, сцвярджае паэт, ён не мае мовы. І раптам Куляшоў робіць, здавалася б, унутраны, лагічны, але для нас усё ж нечаканы вывад:

...Яму, без мовы,
Як называць вясну вясной?

Мы ўжо гаварылі аб тым, што Аркадзь Куляшоў даўно адмовіўся ад застарэлых і ўжо заўтаматызаваных форм паэтычнасці, калі спяванне птушкі, шум лесу, бег ручая, толькі названыя, былі і паэтычнымі катэгорыямі. Цяпер іншае. Мала сказаць, што лес маўчыць. Як аб прыроднай з'яве, гэтым будзе сказана ўсё. Паэзія з'явіцца ад іншага. Лес нямы. Ён паўстае перад намі як жывая істота, якая мучаецца ад сваёй нематы. А яму без мовы нельга назваць «вясну вясной». Вось у гэтым радку і галоўнае. Здаецца, гэты нямы як бы курчыцца ад натугі, каб выгукнуць ёмістае, агністае слова «вясна».

Але вернемся да паэмы «Цунамі».

Як можна жыць разцу без разбяра,
Нявыказаным думкам — без паперы,
Паперы — без чарніла і пяра?

Напэўна, зусім правамерна будзе сцвердзіць, што ўся паэма «Цунамі», як і папярэдняя «Новая кніга» Аркадзя Куляшова, гэта спрэчка аб месцы паэта ў свеце, аб свабодзе і несвабодзе мастака, аб нашым бурным веку, спрэчка, у якой паэт з'яўляецца актыўным праціўнікам пасіўнасці, разгубленасці, безабароннай прыгнечанасці чалавека.

Дык што ж такое цунамі?

Цунамі — гэта гіганцкія хвалі, якія ўзнікаюць у выніку моцных падземных і надземных землетрасенняў нашага бурнага *дваццатага веку і якія здольны* глыбока пранікаць у сэрцы жыхароў нашай планеты. Абрушваючыся на слабыя душы, цунамі могуць рабіць у іх велізарныя спусташэнні, а моцныя загартоўваюцца яшчэ мацней.

Няма шляхоў для самазахавання,
Няма дарог да света забыцця
У час ліхі ўзаемапалявання
Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця.
Адзінства гартаваць людзей павінна,
Каб раз'яднанасць не магла ў бацькоў
Бацькоўства адабраць, пазбавіць сына
На хлеб і сонца спадчынных правоў.

Алесь КУЧАР.

А. Куляшоў. «Цунамі». Паэма. «Полымя». № 9. 1968.

З ЮБІЛЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ



М. САВІЦКІ. ПАКАРАННЕ СМЕРЦЮ (масла).

ВЫЙДУЦЬ У 1969-м

РАСКАЗВАЕ дырэктар выдавецтва «Народная асвета» У. ЛЯЎДАНСКІ

Асноўная прадукцыя нашага выдавецтва — падручнікі для сярэдняй агульнаадукацыйнай працоўнай політэхнічнай школы. Пералічваць іх, вядома, няма патрэбы. Аднак асобныя з іх усё ж хочацца назваць. Гэта, перш-наперш, новыя падручнікі, якія выходзяць сёлета ўпершыню. Сярод іх — «Буквар» А. Клышкі, які атрымаў другую прэмію на рэспубліканскім конкурсе, «Роднае слова» В. Ціханрававай, Ц. Крысько (В. Віткі) і В. Суша, «Родная літаратура» (хрэстаматыя) Л. Тамашовай і Л. Царанкова, «Беларуская савецкая літаратура» (IX—X класы) Ю. Пшыркова і Н. Перкіна, «Грамадазнаўства» Г. Шахназарава і інш., «Хрэстаматыя па грамадазнаўству» і іншыя падручнікі.

Чацвёрты год працягваем мы выданне «Школьнай бібліятэкі». Сёлета яна папоўніцца кнігамі «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі, «Салавей» Зм. Бядулі, «Месяц за месяцам» В. Вольскага, «За палямі, за лясамі» М. Калачынскага, «Прысяга» К. Кірэенкі, «Прыгоды Міхася» Я. Коласа, «Казкі народаў СССР», «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» М. Лынькова, «Апавяданні» Я. Маўра, «Апавяданні і казкі» А. Якімовіча. У гэтай жа серыі выходзіць зборнік твораў савецкіх пісьменнікаў пра Уладзіміра Ільіча Леніна «Жыве між нас геній», зборнік вершаў і апавяданняў сучасных беларускіх пісьменнікаў для падлеткаў «Мары юначыя», а таксама кнігі А. Гайдара і Г. Уэлса.

Два гады назад мы пачалі выдаваць зборнікі літаратурна-*крытычных артыкулаў*, якія, на нашу думку, дапамогуць настаўнікам, выкладчыкам роднай літаратуры. Сёлета таксама выйдзе такі зборнік. У артыкулах, сабраных у кнізе, аналізуецца творчасць І. Шамякіна, У. Дубоўкі, С. Грахоўскага, А. Кулакоўскага, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, І. Новікава, А. Вялюгіна, М. Калачынскага, А. Бялевіча, А. Русецкага, А. Макаёнка.

Выкладчыкі беларускай літаратуры атрымаюць у гэтым годзе багата аформленыя альбомы і плакаты па творчасці Змітрака Бядулі, Цёткі, Францішка Багушэвіча, Аркадзя Куляшова.

Разнастайны і цікавы практычны матэрыял для выкарыстання на ўроках і ў пазакласных занятках па мове і літаратуры змяшчаюць кнігі «Пазакласная работа ў пачатковай школе», «Настольная кніга настаўніка пачатковых класаў», «Пазакласнае чытанне ў эстэтычным выхаванні вучняў» З. Клецкай, «Літаратурна-краязнаўчы гурток» І. Лепяшава, «Жывапіс на ўроках літаратуры» Н. Лур'е і Т. Ржавускай, «Падарожжа ў XIX стагоддзе» А. Мальдзіса, «Вывучэнне трылогіі Я. Коласа «На ростанях» у школе» Л. Тамашовай, «Вывучэнне аглядных тэм па беларускай літаратуры ў старэйшых класах сярэдняй школы» Л. Царанкова і інш.

Настаўнікі знойдуць у тэматычным плане нашага выдавецтва 1969 года і літаратуру, якая адкажа на пытанні аб тым, як выкарыстаць краязнаўчы матэрыял на ўроках гісторыі і грамадазнаўства, як правесці экскурсію, арганізаваць ранішнік, як абсталяваць хімічны ці фізічны кабінет, як навучыць вучняў пісаць творчыя работы, як арганізаваць дзяцей на тую ці іншую добрую справу.

Сярод дапаможнікаў і метадычнай літаратуры для настаўніка варта, думаецца, назваць такія кнігі, як «Беларускія народныя гульні» Я. Вількіна. Гэтыя кнігі зацікавяць, трэба спадзявацца, не толькі вучняў, *настаўнікаў, работнікаў* дашкольных дзіцячых устаноў, але і іншыя катэгорыі чытачоў.

Нямала дапаможнікаў будзе выдадзена і для вучняў. Сярод іх упершыню выдаюцца зборнік «Загадкі» А. Гурскага, кнігі пазнаваўчых нарысаў «У бабровым царстве» Б. Яфрэмава, «Лясныя знаходкі» Ул. Мяжэвіча, «Першыя людзі на тэрыторыі БССР» В. Будзько, «Чаму так названа?» В. Жучкевіча, «Школа прыроды» Я. Казакевіча, «Апавяданні аб каменнях» В. Шарая і інш.

Усяго мы выдадзім 271 назву кніг, брашур, альбомаў і плакатаў агульным тыражом больш 8 мільёнаў экземпляраў.

РАСКАЗВАЕ дырэктар выдавецтва «Вышэйшая школа» І. ЕСЬМАН

Для студэнтаў філалагічных факультэтаў мы выдаём падручнікі і вучэбныя дапаможнікі «Беларуская дыялекталогія» Э. Бліновай і Я. Мяцельскай, «Практыкаванні і матэрыялы па гісторыі беларускай мовы» М. Булахава, «Стараславянская мова» В. Крыўчык і Н. Мажэйка, «Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы» М. Яўневіча і П. Сцяцко.

Вучэбны дапаможнік С. Школьнікава «Грым» адрасуецца студэнтам тэатральных навучальных устаноў, а «Пабудова і перспектыва малюнка» І. Шэшкі — студэнтам-завочнікам факультэтаў педагогікі і методыкі пачатковага навучання педагагічных інстытутаў.

Сёлета мы ўпершыню выдаём падручнік для вучняў музычных школ-сямігодак па курсу «Беларуская савецкая музычная літаратура». Падрыхтавалі яго Г. Глушчанка і К. Сцэпанцэвіч.

Студэнты-філолагі, выкладчыкі і настаўнікі, а таксама ўсе, хто імкнецца павысіць культуру сваёй мовы, зацікавяцца, пэўна, кнігай кандыдата філалагічных навук М. Баркоўскага «Рускі слоўны націск».

Другім, дапоўненым і выпраўленым выданнем, выпускаем мы ў гэтым годзе «Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік» А. Макарэвіча.

Назаву яшчэ некалькі манаграфій па пытаннях філасофіі і літаратуразнаўства, якія таксама выйдуць сёлета. Гэта — «Праблема развіцця ў філасофіі і прыродазнаўстве» В. Марозава, «Развіццё культуры ў БССР за гады Савецкай улады» С. Ешына, «Ідэалогія сучаснага рэфармізму» В. Уварава, «Тарас Шаўчэнка і Беларусь» П. Ахрыменкі.

Асобна хочацца назваць манаграфію Л. Барага «Беларуская казка». У гэтай кнізе аўтар праводзіць параўнаўчы стылістычны аналіз беларускіх, рускіх і ўкраінскіх казак, характарызуе асаблівасці беларускіх казак. Ён таксама разглядае пытанне аб народнай казачнай традыцыі ў Савецкай Беларусі.

І яшчэ адна кніга. Называецца яна «Пытанні беларускай тапаніміі». Гэта зборнік навуковых дакладаў Першай беларускай тапанімічнай канферэнцыі, якая адбылася ў Мінску 28—30 лістапада 1967 года.

УСМЕШКІ МЕЛЬПАМЕНЫ

БЕЗ ВАЛАКІТЫ

Адзін малавядомы літаратар напісаў п'есу. Злачынства не вельмі вялікае, і так, трапіўшы аднойчы да адказнага работніка па службовых справах, ён не вытрымаў і прызнаўся ў гэтым.

— А на якую тэму п'еса? — пацікавіўся адказны работнік.

— На сучасную.

— З сабою?

Літаратар хуценька выцягнуў п'есу з партфеля і паклаў на стол.

— Дык, што ж ты, браце мой, маўчыш, — з паблажлівым дакорам паківаў галавой начальнік і... націснуў кнопку.

Праз некалькі хвілін увайшоў другі адказны работнік.

— Вось таварыш напісаў п'есу на сучасную тэму. Вазьмі, прачытай яе і дай справе ход, — загадаў першы адказны работнік.

Другі адказны работнік вярнуўся ў свой кабінет і... націснуў кнопку ў сваім стале.

У пакой увайшоў трэці адказны работнік.

— Вось п'еса, — сказаў другі адказны работнік, перадаючы п'есу трэцяму адказнаму работніку,— тэма вельмі актуальная. Пачытай і дай справе ход.

Трэці адказны работнік вярнуўся ў свой кабінет і пазваніў у тэатр галоўнаму рэжысёру.

— Зайдзі, ёсць пільная справа.

Чакаючы рэжысёра, трэці адказны работнік пазнаёміўся з дзеючымі асобамі п'есы, перагарнуў некалькі старонак рукапісу і нават прачытаў адзін маналог.

— Вось цікавая п'еса, — сказаў трэці адказны работнік, калі задыханы рэжысёр апусціўся ў крэсла каля яго стала. — Прачытай і дай справе ход.

Рэжысёр прыйшоў дадому на абед, і, кінуўшы рукапіс на канапу, сказаў жонцы:

— Прачытай, калі ласка, што гэта за п'еса. У мяне няма часу.

У жонкі рэжысёра званка не было, да таго ж яна якраз рыхтавалася да вечара, бо была актыўным членам драмгуртка пры домакіраўніцтве. Калі муж памчаўся на работу, яна, ледзь прачытаўшы прозвішча аўтара п'есы, падмалявала губы і адправілася на рэпетыцыю. А пасля ў яе было яшчэ многа ўсялякіх іншых турбот — не да драматурга, не да п'есы. Яна паспела толькі перакласці рукапіс з канапы на падаконнік.

— Ну, як п'еса? — спахапіўся неяк муж.

Рэжысёрша паціснула плячыма.

— Сырая... і рыхлая. І наогул, нічога асаблівага.

І яна мела рацыю. П'еса сапраўды адсырэла на падаконніку. Рэжысёр узяў яе і далажыў аб гэтым трэцяму адказнаму работніку, трэці — другому, другі — першаму. А той, каб не разводзіць валакіты, адразу ж пазваніў аўтару.

— Чыталі многія таварышы. Сырая... Рыхлая... Наогул... працаваць трэба. Вось так.

Леанід ПРОКША.

ДЛЯ ВАС, БІБЛІЯТЭКАРЫ

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна рыхтуе да выдання рад метадычных матэрыялаў у дапамогу бібліятэкарам рэспублікі. Сюды ўвойдуць інструкцыйна-метадычныя пісьмы па прапагандзе біяграфіі У. І. Леніна сярод розных груп чытачоў, парады, як правесці тэматычны юбілейны вечар, метадычныя матэрыялы для правядзення навукова-практычных канферэнцый у бібліятэках на тэму: «У. І. Ленін і развіццё бібліятэчнай справы ў краіне».

Плануюцца таксама выданні, у якіх будзе абагулены вопыт работы лепшых бібліятэк. Супрацоўнікі кабінета бібліятэказнаўства рыхтуюць да выдання гісторыю некаторых сельскіх, раённых, гарадскіх і дзіцячых бібліятэк рэспублікі.

Рыхтуецца да выдання брашура-агляд Г. Санкозай «Бібліятэчная справа БССР у 1968 г.» і рад іншых.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

САМАБЫТНАСЦЬ

ВЫСТАЎКА самадзейнага мастака Мікалая Якаўлевіча Шчалканогава адкрылася нядаўна, і ў кнізе водгукаў запоўнены пакуль толькі першыя старонкі. Але ўжо мяркуючы па іх, можна сказаць, што сустрэчы мастака з мінчанамі цёплыя.

Пачынаючы з 1952 года, Шчалканогаў — удзельнік многіх міжраённых і абласных выставак самадзейнага мастацтва. І сёння, калі гледачу прадстаўлена каля васьмідзесяці яго жывапісных работ, ёсць сярод іх і тыя, першыя, з якімі Мікалай Якаўлевіч дэбютаваў семнаццаць гадоў назад на абласной выстаўцы народнай творчасці ў Маладзечна.

Найбольш прыкметная з іх — «Янка-трактарыст». Сюжэт карціны просты: у непагодны асенні дзень трое дзяцей прынеслі на поле бацьку або брату абед: пара збіраць посуд, ісці дамоў, але яны прыселі, хочуць убачыць, як Янка заводзе трактар, пачне баразну. Перададзена ўсё гэта без мудрагельства, мазкі дакладныя, выразныя, простая і зразумелая кампазіцыя — адвярнуцца, сочаць за трактарам трое азяблых дзяцей, але зразумела нам яшчэ і тое, што мастак нераўнадушны да гэтай, здавалася б, нічым не прыкметнай сцэнкі, ён добра разумее усіх яе ўдзельнікаў, спачувае ім.

Такіх жанравых карцін няшмат на выстаўцы Шчалканогава. Да «Янкі-трактарыста» блізкія сваёй выразнасцю, верагоднасцю, шчырасцю і некалькі больш позніх работ. Гэта перш за ўсё эцюды і эскізы да карціны і само палатно «За зямлю беларускую». У фігурах і ў тварах партызан, якія схапіліся ўрукапашную з ворагам, выказаны адзіны агульны настрой — высокая напружанасць, гнеў, упэўненасць у перамозе.

Да першых выставачных работ Шчалканогава адносіцца і яго пейзаж «Партызанскія сцежкі», выкананы на кардоне. Нібы і небагаты абраны мастаком матэрыял уражанняў: цёмная паласа зімовага лесу, на яго фоне белы хутарскі дах, наперадзе заснежаная раўніна з хмызняком. Набор фарбаў таксама сціплы. Але мастак дасягае, бадай, галоўнага — мы выразна адчуваем цішыню зімовага змроку, ціхамірны спакой, які пануе ў гэтым далёкім лясным кутку, і не сумняваемся, што якраз гэты куток быў аблюбаваны калісьці партызанамі.

Да серый пейзажаў, характэрных сваім мяккім лірызмам, можна аднесці і такія работы мастака, як «Бакштанскі край», «Дарога», «Першы замаразак». Блізкая да іх па змесце і карціна « Мястэчка Трабы» — вулічка, заднія двары старажытнага беларускага сяла. Гледзячы на гэтую карціну, лёгка пераконваешся, што мастак беражліва і любоўна перадаў утульнасць і своеасаблівую прыгажосць гэтага даўно абжытага людзьмі месца.

Мікалай Шчалканогаў родам з Пермскай вобласці, але адразу пасля дэмабілізацыі, у 1948 годзе, былы афіцэр-франтавік пасяліўся ў Беларусі.

Адрас пейзажаў мастака? Ён лёгка пазнаецца на лепшых яго палотнах. Лясныя ўрочышчы і партызанскія схованкі, рэкі і заліўныя лугі. Гэта: «Пасёлак Іўе», «Нёман», «Саўгас Чарнелі», «Бакштанскі лес», «Май у вёсцы». Беларусь...

А колькі заўважаных у розныя поры года, у рознае надвор'е бяроз і тапаляў, клёнаў і вербаў напісаў мастак. У яго зборы яны складаюць асобную галерэю. Вось, напрыклад, адна з іх — «Шуміць вясна», у якой цяжка прызнаць звычайна стрыманую манеру пісьма Шчалканогава — свабоднымі мазкамі ў яркіх колерах — блакітным, белым — намаляваны распушчаныя галінкі вербаў, алешын над неспакойнай, пабліскваючай вадой. Адчуваеш, што налятае вясновы парывісты вецер. І тут жа непадалёк карціна «Бярозкі», — дрэвы яркія, святочныя, дзесьці ў самы разгар вясны, і колеры падабраны для іх незвычайныя — вішнёвы, чырвоны, сіні. Але вось насупраць зноў бярозы, цяпер «старыя», «серабрыстыя» — і, сапраўды, спакойныя, велічныя.

Прыглядаючыся да прадстаўленых на выстаўцы пейзажаў Шчалканогава, відома, не цяжка заўважыць уплыў на мастака такіх майстроў, як Левітан і Куінджы.

Мікалай Якаўлевіч і сам любіць гаварыць, што ён не можа забыць і пастаянна бачыць, адчувае карціны любімых мастакоў.

На агульным фоне прадстаўленых мастаком цікавых, змястоўных работ, трохі слабей выглядае яго партрэтны жывапіс, хоць адна з апошніх работ («Партрэт дзяўчыны ў светлым») вылучаецца непасрэднасцю, мяккасцю.

Мікалай Шчалканогаў — мастак самадзейны, але, гаворачы аб яго выстаўцы, хочацца сказаць, што гэта сталы, самабытны майстар, са сваёй манерай пісьма, са сваім светам чыстых, адухоўленых вобразаў.

І, бадай, адзінае, чаго хочацца пажадаць мастаку, — быць усё-такі шырэйшым, разнастайнейшым і смялейшым у пошуках, што несумненна павінна прывесці яго да новых творчых удач.

А. ГРЫЧАН.

У МАЛЫМ АРШАНСКІМ




На праспекце Тэкстыльшчыкаў у Оршы, непадалёк ад прахадной славутага ільнокамбіната, стаіць не вельмі самавітая знадворку будыніна. Месцілася ў ёй ў свой час камбінацкае пажарнае дэпо. Восем гадоў назад пажарнікі справілі наваселле, а ў былое дэпо прыйшлі будаўнікі — муляры і тынкоўшчыкі, цесляры і маляры. Пасля капітальнага рамонту будыніна набыла новы выгляд, аднак усё ж засталася несамавітай: не будзеш жа нанова перакладаць сцены, рушыць муры і столь.

Але, мусіць, гэтую несамавітасць заўважае толькі свежы, прыезджы чалавек. А спытайце любога аршанскага тэкстыльшчыка, што гэта за будынак, дык пачуеце ў адказ: «Гэты? Дзіцячы Палац культуры! Наш, камбінацкі!» І сказана гэта будзе не без гонару.







Так, былое памяшканне пажарнага дэпо пасля перабудовы было аддадзена дзецям і ўнукам аршанскіх ткачоў і ткачых. Дзеці адзінадушна далі свайму дому назву: «Малы Палац культуры Аршанскага ордэна Леніна ільнокамбіната», — мусіць таму, што камбінат мае яшчэ і «вялікі» Палац культуры — для дарослых.

Малы Палац культуры адкрыўся ў 1961 годзе (дарэчы, установа такога роду ў рэспубліцы пакуль што адзіная). На пачатку, як і ў любой новай справе, не ўсё ішло гладка. Але было галоўнае — піянеры і школьнікі з першых жа дзён адчулі сябе ў гэтым доме поўнымі гаспадарамі. З душой аднеслася да гэтай справы кіраўніцтва камбіната. І дзіцячы Палац культуры ільнокамбіната зажыў цікавым, бурлівым жыццём.

Сёння яго называюць сваім домам каля тысячы дзяцей і ўнукаў тэкстыльшчыкаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі розных узростаў праводзяць тут свой вольны час, і кожны знаходзіць тут занятак па душы, па густах і схільнасцях: дваццаць сем гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці працуюць у Малым Палацы культуры! Аматары песень спяваюць у хоры, юныя танцоры займаюцца ў танцавальным калектыве, хлопчыкі і дзяўчынкі, якіх вабіць сцэна, ходзяць на заняткі драматычнага калектыву, будучыя мастакі аб'ядналіся ў гуртку выяўленчага мастацтва. Працуюць у Малым Палацы культуры аркестр народных інструментаў, тэатр лялек, радыё, фота, авія- і суднамадэльныя гурткі. Для дзяўчынак старэйшых класаў ёсць гурток кроя і шыцця. Ну, а аматары спорту маюць магчымасць займацца ў секцыях лёгкай атлетыкі, футбола, валейбола, баскетбола...

Наш фотакарэспандэнт Ул. Крук пабываў у Малым Палацы культуры аршанскіх тэкстыльшчыкаў звычайным студзеньскім днём і зрабіў там гэтыя здымкі.

У адным з пакояў ішла рэпетыцыя малодшай групы танцавальнага калектыву, якім кіруе Лідзія Ярмоленка (здымак уніце). У калектыве — 78 хлопчыкаў і дзяўчынак. Юныя танцоры неаднаразова выступалі ў падшэфным Дубровенскім дзіцячым доме, у школах горада, перад сваімі бацькамі на сцэне «вялікага» Палаца культуры. Танцуюць яны «Лявон», «Бульбу», «Качачку», «Ланцужок» і іншыя танцы. Фотакарэспандэнт застаў юных танцораў у час рэпетыцыі танца «Матрошкі».

У той дзень былі рэпетыцыі і ў тэатры лялек. За апошнія два гады тэатр паказаў сваім гледачам дзесяткі прэм'ер. Ягоныя спектаклі бачылі нават віцябляне — тэатр быў удзельнікам абласнога агляду лялечных дзіцячых калектываў і заваяваў пуцёўку на заключны паказ. Да гэтага адказнага экзамену і рыхтуюцца цяпер юныя артысты-лялькаводы на чале са сваёй настаўніцай Адай Лешавай.

З невялікага драмгуртка ў Малым Палацы культуры вырас за гады і тэатр юнага гледача. Узначальвае яго старэйшая артыстка народнага тэатра ільнокамбіната Анфіса Іванаўна Прылуцкая. Многія выхаванцы Анфісы Іванаўны не развітваюцца са сцэнай і пасля заканчэння школы, самастойна кіруюць драмгурткамі па месцы работы альбо жыхарства. Так, былы ўдзельнік драмгуртка дзіцячага Палаца культуры Генадзь Буйніцкі кіруе калектывам аматараў у гарадскім пасёлку Барань. А Аляксандр Цітоў, які таксама наведваў заняткі драмгуртка, займаецца ў студыі Віцебскага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

Фотакарэспандэнт застаў юных артыстаў у той момант, калі Анфіса Іванаўна чытала ім новую п'есу — «У строгім сакрэце» У. Ватоліна.

Трэці зверху здымак зроблены ў пакоі юных авіяаматараў. Хто ведае, можа менавіта заняткі ў авіямадэльным гуртку дзіцячага Палаца культуры вызначаць будучыню сённяшняга школьніка Валерыя Салодкага...

Днём і вечарам поўніцца галасамі Малы Палац культуры аршанскіх тэкстыльшчыкаў — дом 1000 юных гаспадароў.

М. БЛІЗНЮК.





ЗАРУБЕЖНАЯ НАВЕЛА



АДНОЙЧЫ ў гутарцы адзін з субяседнікаў сказаў: «Як быццам і непрыгожая, але цікавая».

— Цікавая, — задуменна паўтарыў прафесар Тутка. — Так і я сказаў калісьці. Так... Я ведаў калісьці цікавую жанчыну. Калі хочаце, панове, я раскажу вам пра яе.

— Калі ласка, мы вас слухаем. Жанчына, і да таго ж цікавая. Пэўна, нейкая гісторыя.

— Дык вось. Я яшчэ быў студэнтам і ледзь зводзіў канцы з канцамі. У адным правінцыяльным горадзе ў мяне была багатая цётка. Я прасіў яе дапамагчы мне. Але яна назвала мне больш дзесяці славутых людзей, якія ў маладосці таксама цярпелі нястачу, што не перашкодзіла ім пазней праславіцца на ўвесь свет. Цётка лічыла, што нястачы і мне пойдуць на карысць, — маўляў загартуюць мой дух. Давялося прыняць гэта да ведама і больш пра грошы не заікацца. Праз некалькі гадоў я даведаўся, што цётка памёрла і пакінула завяшчанне. Вялікую суму цётка ахвяравала на будаўніцтва шпакоўняў для птушак, на таварыства жанчын, якія не кураць тытуню, на бадзёрых духам старых і, як ні дзіўна, не забылася і пра мяне. Мне яна пакінула даволі значную суму, якая мне пры маёй беднасці здалася неймавернай. Выканаўца завяшчання цёткі заявіў, што ўсё ў парадку, і як толькі будуць выкананы ўсе фармальнасці, я атрымаю свае грошы. Але, як бліжэйшы сваяк нябожчыцы, я магу аспрэчваць завяшчанне. Толькі хіба мог я пайсці на тое, каб пазбавіць пеўчых птушак прытулку, пакрыўдзіць жанчын, якія не кураць, а тым больш старых, якія захавалі бадзёрасць духу.

Адвакат выплаціў мне значную суму ў рахунак завешчанага мне цёткай, каб я не сумаваў, пакуль не будуць выкананы ўсе фармальнасці.

Скажыце, чым заняцца ў ціхім правінцыяльным гарадку , калі вы адны і вам няма чаго рабіць? Я агледзеў усё, што мог,—гэта значыць, касцёл і руіны крапаснай сцяны. Я пайшоў у лепшы рэстаран і заказаў самыя дарагія стравы.

Першы раз у жыцці ў мяне было столькі грошай. Я быў шчаслівы і ад радасці проста ашалеў. Мяне ахапіла жаданне весяліцца. А як загадаеце забаўляцца ў гэтым ціхім гарадку?

У першы ж дзень я пайшоў у мясцовы тэатр. Пасля другога акта на сцэну ўнеслі кошык кветак для артысткі, якая чароўнай усмешкай падзякавала за апладысменты. Я зразумеў, што гэта мясцовая «зорка». Убаку стаяла маладзенькая актрыса, якая выконвала ролю субрэткі. За ўвесь спектакль яна не прамовіла і двух слоў. Не скажу, што яна зацікавіла мяне як актрыса або як жанчына. Яна здалася мне непрыгожай, я б нават сказаў брыдкай.

На другі дзень я адправіўся ў кветкавы магазін і, заказаўшы кошык самых лепшых кветак, папрасіў аднесці яго вечарам у тэатр, На картцы вывеў усяго два словы — «цікавай артыстцы» і ўклаў яе ў канверт, на якім было імя і прозвішча той самай сціплай артысткі. Пасля другога акта, як і напярэдадні, унеслі кошык кветак і паставілі перад зоркай, якая зноў падзякавала гледачоў усмешкай. І раптам уявіце сабе, сенсацыя: уносяць мой кошык і ставяць ля ног сціплай артысткі. А кветкі намнога прыгажэйшыя.

Не падумайце, што я шукаў зачэпкі, каб завязаць знаёмства з дзяўчынай. Гэта быў усяго толькі жарт, свавольства хлопца, у якога закружылася галава ад лішніх грошай і якому хацелася выкінуць нейкі неверагодны трук. Назаўтра я зноў заказаў кошык самых прыгожых кветак для ўжо вядомай вам пярсоны. І зноў — канец другога акта, апладысменты, два кошыкі кветак. Адным словам, усё гэтак жа, як і ў мінулы раз. Я заўважыў, а можа, мне толькі здалося, што зорка нервуецца. Маладая актрыса, як і раней, здавалася мне непрыгожай, аднак я лавіў сябе на думцы, што яна стройная, зграбная ў рухах, што ў яе прыемны голас, а тыя некалькі слоў, што яна гаворыць, песцяць вуха. Твар хоць і непрыгожы, але не пазбаўлены выразнасці, незвычайны. Адным словам, цікавая дзяўчына.

Раніцай я пайшоў у кветкавы магазін і дамовіўся, што імя таго, хто прысылае кветкі, будзе захавана ў тайне. Потым папрасіў, каб кожны вечар на працягу бліжэйшага тыдня ў тэатр адносілі кошык архідэй з карткай, на якой нічога не павінна быць напісана, апрача прозвішча і імя маладой актрысы і слоў — «цікавай артыстцы». Сам я ў тэатр не хадзіў, каб не звярнуць на сябе ўвагі. Аднак штодня я бываў у кандытарскай, дзе збіраліся акцёры пасля рэпетыцый, і тое-сёе падслухаў. Я даведаўся, што «мая актрыса і кошыкі кветак, якія я пасылаў ёй, асабліва архідэі, выклікалі вялікую цікавасць. «Хто б гэта мог быць?.. Заўсёды адна... А калі гэта які-небудзь мільянер, дык, напэўна, нетутэйшы. Хто ў гэтым горадзе будзе выкідваць грошы на архідэі...»

Усё-такі я дабіўся, чаго хацеў. Усё атрымалася на славу. Праз нейкі час я даведаўся, што «маёй» збіраюцца даць вялікую ролю.

— Звар'яцелі, — заявіла адна.

— Праваліцца з трэскам, — падтрымала другая.

Тут падаў голас стары сівы акцёр: «Як знаць... як знаць... усё ж гэта дзяўчынка вельмі цікавая». — «Пашлі ёй архідэі», — злосна прашыпела нейкая артыстка.

Я забаўляўся, як ніколі ў жыцці. Мне самому было цікава, што ж будзе далей.

На жаль, мой прафесар тэрмінова выклікаў мяне. Я вымушаны быў адмовіцца ад далейшых штукарстваў, пакінуў горад і вярнуўся да сваіх навуковых абавязкаў.

Аднак праз нейкі час я заўважыў, што часта, вельмі часта ўспамінаю сваю артыстку-золушку, чую яе мілы галасок, бачу зграбныя рухі. Яна ўяўлялася мне такой, як у першы вечар, калі апладзіравалі яе партнёрцы, а яна сціпла стаяла ўбаку. Яе твар быў самотны, але затое колькі ў ім было выразнасці! Іншы раз яна бачылася мне ў канцы алеі, па якой я прагульваўся, мроілася ў вагоне, у кватэры, нават у маёй лабараторыі. «Хм, — думаў я, — усё яна ды яна... Ужо ці не закахаўся я? Глупства!». Я называў сябе набітым дурнем. Нішто не дапамагала. Ішлі месяцы. Неяк у мяне выдалася некалькі вольных дзянькоў, і я вырашыў з'ездзіць у той самы горад, дзе яна выступала.

Я пайшоў у кандытарскую, дзе збіраліся артысты, але там было пуста. Старшы афіцыянт пазнаў мяне і падсеў пагаманіць. Я пытаўся ў яго аб тым, аб сім, каб непрыкметна навесці размову на цікавую для мяне тэму. Загаварыў аб тэатры, пералічыў некалькі імёнаў і як бы мімаходзь назваў дзяўчыну, якая мяне цікавіла. «Так, — сказаў афіцыянт, — цікавая дзяўчына». «Цікавая?» — паўтарыў я, заінтрыгаваны. Але ў гэты час афіцыянта паклікалі, і размова абарвалася. Я ўзяў са стала газету, і стаў чытаць рэцэнзію на ўчарашнюю прэм'еру. Я вычытаў, што тая, дзеля якой я прыехаў, — «цікавая». Тут вярнуўся афіцыянт. Ад яго я даведаўся, што яшчэ паўгода назад на гэту дзяўчыну ніхто не звяртаў увагі. Потым усе раптам загаварылі аб ёй. І вось атрымлівае цяпер вялікія ролі. Вядома, дзякуючы апекуну. «Апекуну?» — запытаўся я. Афіцыянт азірнуўся і загаварыў цішэй. Расказаў, што самы вядомы з тутэйшых адвакатаў (як я здагадаўся, гаварылі пра майго былога адваката) палічыў яе цікавай. Настолькі цікавай, што збіраецца дзеля яе нават пакінуць жонку.

Якраз у гэты час шумнай гурбой увайшлі артысты. У мяне затрымцела сэрца, калі сярод іх я ўбачыў тую, дзеля якой я прыехаў. Артысты размясціліся за столікам ля акна, і я сядзеў насупраць іх. «Маю» я бачыў зараз зусім блізка і мог разгледзець як належыць. У яе амаль нічога не засталося ад той сціплай, забітай золушкі, якую я калісьці ўбачыў на сцэне, якая мроілася мне потым у парку, у вагоне, у лабараторыі. Была яна раскошна апранута, трымалася свабодна і ўпэўнена. Яна некалькі разоў кідала позірк у мой бок, але не таму, што я там сядзеў; над маёй галавой на сцяне вісела люстэрка. У душы яшчэ цеплілася надзея, што яна заўважыць мяне. Як-ніяк гэта ж я зрабіў з яе цікавую жанчыну. І я першы назваў яе так і першы ж паверыў у гэта. Аднак яна глядзела не на мяне, а праз мяне, нібы я быў якімсьці прадметам. Мне стала не па сабе.

Я адчуў, як у маёй душы закіпаюць крыўда і злосць. Сёння ж паеду. «Не хачу цябе бачыць... Няхай прападае білет, які я купіў яшчэ раніцай, як толькі ўбачыў на афішы тваё прозвішча... Бліжэйшым поездам, сёння ж, я вяртаюся дамоў, да сваёй работы». Са шчымлівым сэрцам пакінуў я горад...

Прафесар Тутка сядзеў, задумаўшыся. Ён кончыў свой сённяшні расказ, які на гэты раз быў даўжэйшы, чым звычайна.

— Ну і доўга яшчэ вы пакутавалі? — запытаўся нехта.

— Два тыдні. Пакуль мне не сустрэлася жанчына, яшчэ больш цікавая.

Пераклад з польскай мовы.

ВЕРНАСЦЬ ІДЭІ

У бязлюднай лясной мясцовасці, на шашы паміж Берлінам і Патсдамам, спыняецца ваенная машына. З яе выходзяць некалькі нямецкіх салдат і афіцэраў. Адзін з іх выштурхоўвае з машыны чалавека ў матроскай бесказырцы са звязанымі за спіной рукамі. Яго вядуць у лес. Стрэл. Так баязліва, па-зладзейску распраўліся з нямецкім рэвалюцыянерам, членам групы «Спартак» Эрвінам тыя, хто ненавідзеў рабочых і матросаў, якія ўзняліся ў лістападзе 1918 года на барацьбу з нямецкай імперыялістычнай буржуазіяй.

Гэтай сцэнай пачынаецца кінафільм «Мёртвыя застаюцца маладымі», выпушчаны кінастудыяй ГДР «Дэфа» да 50-годдзя лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі. Фільм зняты па сцэнарыі Крысты Вольф і Іахіма Кунерта, у аснову сцэнарыя пакладзены аднайменны раман вядомай нямецкай пісьменніцы Анны Зэгерс.

Аўтары фільма ўмела выкарысталі канву літаратурнага твора, вельмі цяжкага для экранізацыі. Яны паказалі ўсю складанасць і супярэчлівасць грамадскага развіцця Германіі, пачынаючы з моманту паражэння лістападаўскай рэвалюцыі і канчаючы разгромам германскага фашызму ў 1945 годзе.

Перад гледачамі праходзіць мноства людзей, розных па сацыяльным паходжанні, палітычных поглядах і перакананнях. Яны выразна падзяляюцца на два процілеглыя лагеры. Да аднаго з іх належыць прадстаўнікі нямецкага пралетарыяту— камуністы Эрвін Марцін, Трыбель, сацыял-дэмакрат Гешке. У другім — прадстаўнікі нямецкай буржуазіі, прускіх баронаў і прускага юнкерства — фабрыкант Клем, фон Венцлаў, Лівен. Дзеянне фільма разгортваецца на фоне класавай барацьбы, якая вядзецца паміж гэтымі двума лагерамі.


У фільме ярка паказана палітычная інертнасць нямецкіх сацыял-дэмакратаў, іх няздольнасць весці рашучую барацьбу супраць эксплуататараў і здрады справе рабочага класа правымі лідэрамі сацыял-дэмакратыі. Выкліканы гэтым раскол нямецкага рабочага руху адыграў фатальную ролю ў гісторыі Германіі, расчысціўшы фашызму шлях да ўлады. Дарагой цаной расплачваюцца перадавыя і дэмакратычныя сілы Германіі за здраду лідэраў СДПГ, за адмову сацыял-дэмакратаў ад сумеснай з камуністамі барацьбы супраць германскага імперыялізму і мілітарызму.

Аднак справу, за якую аддаў жыццё Эрвін, працягваюць іншыя. У рады змагароў становіцца яго сын Ганс. Едзе ў Іспанію, каб там змагацца са зброяй у руках супраць фашызму, камуніст Марцін. Жывыя свята захоўваюць вернасць загінуўшым змагарам за рабочую справу. Пераемнасць барацьбы нямецкага пралетарыяту і Камуністычнай партыі Германіі супраць капіталізму і гітлерызму складае асноўны змест кінакарціны.

Фільм «Мёртвыя застаюцца маладымі» — падарунак кінематаграфістаў ГДР да юбілею лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі.

В. ГАРДЗЕЕЎ,
карэспандэнт ТАСС.
Берлін.

АЎТАР—ПРЫРОДА



РАНІЦА У САСНОВЫМ ЛЕСЕ. (Амаль па Шышкіну).
Фотаэцюд Л. ЛЯВОНАВА.

ЧЫЙ ГЭТА ПАРТРЭТ?

ВЫСТАЎКА-ЗАГАДКА МАСКОЎСКАГА МУЗЕЯ А. С. ПУШКІНА

Здавалася, сумненняў не было: партрэт належыць сучасніку Пушкіна маскоўскаму паштдырэктару Булгакаву. Такое пачатковае вызначэнне аўтарытэтнай экспертызы. Бянтэжыла толькі ордэнская стужка. Дата партрэта не адпавядала часу ўзнагароджання Булгакава. Пайшлі новыя і новыя праверкі, супастаўленні з рознымі крыніцамі, пакуль дакладна не было ўстаноўлена, што на партрэце не маскоўскі, а пецярбургскі паштдырэктар, яго брат... А колькі такіх партрэтаў даводзіцца апазнаваць работнікам Дзяржаўнага музея А. С. Пушкіна, спецыялістам-крыміналістам, мастацтвазнаўцам вышэйшай кваліфікацыі!

Зараз маскоўскі музей А. С. Пушкіна (вуліца Крапоткіна, 12) ставіць своеасаблівы і цікавы эксперымент. Яго мэта — прыцягнуць шырокія пласты грамадскасці: мастакоў, гісторыкаў, філолагаў, кнігалюбаў, студэнтаў літаратурных і мастацкіх вну, усіх прыхільнікаў пушкінскай паэзіі да вызначэння твораў партрэтнага жывапісу, так ці інакш звязаных з імем А. С. Пушкіна. Тых твораў, аб якіх няма адзінай думкі ў спецыялістаў або наогул яшчэ не склалася ніякай думкі...

На выстаўцы «Партрэты невядомых у зборы Дзяржаўнага музея А. С. Пушкіна» наведвальнікам прапануецца тры пытанні: «Хто намаляваны на партрэце?», «Хто мастак?», «Ці не сустракаліся Вам у якім-небудзь выданні копіі гэтага партрэта, указанні на яго існаванне?». Іншы раз пытанні вар'іруюцца: «Ці згодны Вы з нашым вызначэннем партрэта? Мастака? Эпохі?..»

Больш як восемдзесят партрэтаў экспануецца на выстаўцы. Прыкладна палавіну складаюць тыя, якія музею ўжо ўдалося вызначыць дакументальна або з вялікай ступенню верагоднасці. На некаторых палотнах «апазнаны» намаляваныя асобы, але невядомы мастак. А каля сарака наогул засталіся загадкай. Калектыў музея спадзяецца, што наведвальнікі выстаўкі дапамогуць вырашыць яе.

Побач з некаторымі палотнамі пад шклом размешчаны рэчы, характэрныя для той эпохі: шкатулкі, веeры, вышытыя кашалькі, ордэнскія стужкі, медалі і нават... пісталеты. Ствараючы дух часу, яны могуць дапамагчы пранікненню ў тайну малюнкаў.

Пад ужо «пазнанымі» партрэтамі грунтоўныя тэксты, якія расказваюць аб характары доўгіх, нялёгкіх пошукаў. А ввялі іх і навуковыя супрацоўнікі музея, і яго сябры: таленавіты даследавальнік Іраклій Андронікаў, мастацтвазнаўцы і калекцыянеры Фелікс Вішнеўскі і Якаў Зак, вядомыя пушкіназнаўцы, гісторыкі і проста аматары.

Музей запрашае да пошукаў і разгадак усіх, хто пажадае ў іх удзельнічаць.

Валянцін ВОІНАЎ,
карэспандэнт АДН.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Дазвольце праз вашу газету сардэчна падзякаваць усім арганізацыям і таварышам, якія прыслалі мне свае віншаванні ў сувязі з маім юбілеем і прысваеннем мне ганаровага звання заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

Канстанцыя БУЙЛО.

□

Дазвольце праз вашу газету выказаць маю сардэчную ўдзячнасць усім сябрам, таварышам, арганізацыям, установам, піянерам і школьнікам, якія павіншавалі мяне ў сувязі з прысуджэннем мне Дзяржаўнай прэміі БССР за стварэнне сцэнарыя фільма «Генерал Пушча» і прысваеннем мне ганаровага звання заслужанага дзеяча культуры Беларускай ССР.

Анатоль ВЯЛЮГІН.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

31 студзеня

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Прыродазнаўства. 4-ы клас. «Гарачая апрацоўка металаў». 16-55 — праграма перадач. 17-00 — тэлевізійныя навіны (М). 17-15 — для дзяцей. «Хармс усміхаецца». Перадача з Брэста. 17-50 — дзіцячы экран. «Як Жаконя час згубіў». Лялечны фільм. 18-10 — «Панарама навін». 18-40— «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. 1938 год». 19-25 — «Турнір дапытлівых». 20-10 — год ленінскай ударнай работы. «У ініцыятараў спаборніцтва». Пра хлебаробаў Карэліцкага раёна. 20-30 — «Эстафета навін» (М). 21-15 — «Завулак». Мастацкі фільм. 22-45 — «Цырк у студыі». Цыркавая праграма (М). 23-45 — «Толькі факты» Праграма перадач.

1 лютага

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — тэлевізійныя навіны (М). 10-00 — «Музычная вясёлая праграма» (М). 10-30 — «Рабочы клас Краіны Саветаў». Рэпартаж. (Уключэнне Мінска) (М). 11-30 — «Жыццё танца» (М). 12-30 — «Здароўе». Тэлевізійны часопіс. 13-10 — «Музычная шкатулка». 13-40 — «Запаветам Леніна верныя». Рэпартаж пра Усесаюзную нараду камсамольскіх і бібліятэчных работнікаў. 14-20 — тэлевізійны тэатр для дзяцей. Опера М. Красева «Марозка». Спектакль Дзяржаўнага музычнага дзіцячага тэатра (М). 16-00 — «Народны кантроль» Тэлевізійны часопіс. 17-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-30 — «Тэлевізійны атлас народаў СССР». Таджыкская ССР (М). 19-30 — «На агеньчык». Перадача з Волгаграда. 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 20-45 — «Свет сацыялізма» (М). 21-15 — «Салдаты». Мастацкі фільм (М). 22-55 — першынство свету па скарасным бегу на каньках. (Жанчыны). Перадача з Грэнобля (у запісе) (М). 23-40 — «Толькі факты». Праграма перадач.

2 лютага

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 18-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэарэтычная механіка». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — тэлевізійныя навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — насустрач выбарам у мясцовыя Саветы БССР. «Тэлевізійны агітпункт». 11-00—«Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. (Аматарам шахмат). 11-25 — дзіцячы экран. «Як Тэлевічок мядзведзікаў карміў». Лялечны фільм. 11-55 — для дзяцей «Матрошкіны казкі» (паўтор). 12-30 — «Творчасць юных». Усесаюзны фестываль дзіцячай творчасці. Перадача са Свядлоўска. 13-00 — «Сельская гадзіна» (М). 14-00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Гісторыя, напісаная крывёю». Перадача з Ташкента. 14-30 — А. Штэйн. «Акіян». Спектакль Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя А. М. Горкага. Перадача з Ленінграда. 17-30 — праграма каляровага тэлебачання (М). 20-00 — літаратурны тэатр. «У рэдакцыю не вярнуўся». Прысвячаецца журналістам, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны (М). 21-00 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 21-45 — «Акцёры і ролі». Народны артыст СССР З. Ф. Стома і народная артыстка БССР Г. К. Макарава. Трансляцыя на Маскву. 22-30— «Аўтамабіль, пешаход, вуліца». «Хуткасць, бяспека руху». 22-45 — «Спартыўны тыдзень» (М). 23-00— першынство свету па скарасным бегу на каньках. (Жанчыны). Перадача з Грэнобля (у запісе) (М). 23-45 — праграма перадач.

Калектыў тэатра імя Янкі Купалы выказвае глыбокае спачуванне заслужанаму артысту БССР Р. С. Філіпаву з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 04052